

АЙЧЫННЫ ВЯЛІКІ ЭКСКАВАТАР

4

ТРЫ ДНІ Ў АРХЕАЛАГІЧНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ



8

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

27 ЛІПЕНЯ 2021 г. АЎТОРАК № 141 (29510)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый СЯНЬКО, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Беларусі ў Кітаі:**

*«На працягу першага паўгоддзя Кітай бязвыплатна накіраваў у Беларусь 400 тысяч доз вакцын кампаніі Sinopharm, якая зарэгістравана ў многіх краінах свету, у тым ліку і ў нас. Прэпарат вельмі запатрабаваны, кацірyецца з высокай эфектыўнасцю. Міністэрства аховы здароўя па даручэнні кіраўніка дзяржавы вядзе перагаворы аб закупцы камерцыйнай партыі тавару. Спецыяльна для Рэспублікі Беларусь ёсць добрыя зніжкі. Мы спадзяёмся, што ў хуткім часе будзе падпісаны кантракт і да канца жніўня ў нашу краіну будзе накіравана каля 1 млн доз вакцын, якія будуць размеркаваны па клініках для далейшай вакцынацыі насельніцтва».*

# Танцуе «Берагіня»!



Фота БелТА.

**Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва «Берагіня» прайшоў у гарадскім пасёлку Акцябрскі, што на Гомельшчыне, ужо ў адзінаццаты раз. Па традыцыі сюды з'ехаліся аўтэнтычныя фальклорныя калектывы, выканаўцы народных бытавых танцаў, народныя музыканты, майстры-рамеснікі.**

## КОРАТКА

- **Адзіны дзень бяспекі дарожнага руху 30 ліпеня будзе прысвечаны прафілактыцы ДТЗ з перавышэннем хуткасці.**



- Ашуканцы пад выглядам спецаперацыі выманілі ў жыхаркі Бярозаўскага раёна каля Br8 тысяч.
- **Летні ўніверсітэт стартуе ў БДУ 2 жніўня. Навучанне пройдзе ў анлайн-фармаце на базе адукацыйнага партала БДУ.**
- У Бераставіцкім раёне работнікі сельгаспрадпрыемства патушылі грузавік, які загарэўся. Як мяркуецца, прычына ўзгарання — кароткае замыканне.

ISSN 1990 — 763X

21141>

9 771990 763008

«Гарачая» тэма

## СКІДКІ, РАСТЭРМІНОЎКІ І ШЫРОКІ АСАРТЫМЕНТ

### По ўсёй краіне наступіў час школьных базараў

**Ва ўнівермагах сталіцы стартаваў пашыраны продаж тавараў школьнага асартыменту — адзення, абутку, вучнёўскай галантарэі, канцылярскіх і папярова-белавых тавараў — з выстаўленнем пакупнікам скідак на тавары, правядзеннем дэманстрацый мадэляў, конкурсаў, розыгрышам прызоў і падарункаў.**

Ва ўнівермагу «Беларусь», напрыклад, такія тавары шырока прадстаўлены ў асноўных секцыях «Тавары для дзяцей» і «Канцтавары, цацкі» на 3-м і 4-м паверхах. Дадаткова на 1-м паверсе адкрылася секцыя «Тавары для школы», дзе ў шырокім асартыменце маюцца школьна-пісьмовыя і канцылярскія тавары, вучнёўская галантарэя, абутак і панчошна-шкарпэтачныя вырабы. У секцыі «Тавары для мужчын» можна знайсці вялікі выбар швейных вырабаў і кашуль для хлопчыкаў, а ў павільёне на вул. Сяліцкага, 105, — вучнёўскай галантарэі, панчошна-шкарпэтачных вырабаў, школьна-пісьмовых і канцылярскіх тавараў. З надыходам новага навучальнага года ў асобных секцыях універмага будуць выдзелены гандлёвыя плошчы для продажу канцылярскіх і папярова-белавых тавараў.



СТАР. 5

Ёсць пытанне

## ЧАМУ ЗНІКАЕ ВАДА З КРАНАЎ...

### Спёка — час для эканоміі ці паліву агародаў?



**Беларусь, якую часта называюць Сінявокай, заўжды пазіцыяніравалася як краіна лясоў ды рэк, і недахопу ў гэтых рэсурсах у нас не назіралася. Да апошніх гадоў. З-за анамальна гарачага надвор'я ўзровень падземных крыніц, з якіх сілкуецца большасць водаправодных сістэм краіны, значна панізіўся. Акрамя таго, абмялелі рэкі, вада знікла з многіх калодзежаў, у невялікіх населеных пунктах і нават райцэнтрах часам назіраюцца перабоі з вадой. Дзесьці яна не даходзіць да верхніх паверхаў у пэўныя гадзіны сутак, а дзесьці — яе не было ўвогуле тыдзень. Як, напрыклад, у аграгарадку Ярэмічы Карэліцкага раёна, адкуль да нас звярнуліся з праблемай жыхары, якія абвінавацілі ў празмерным паліве агародаў і сказалі, што з-за гэтага вада і знікла. Што насамрэч здарылася з вадой, чаму і куды яна падзелася, што рабіць, каб яе захаваць, і ці дапамагаюць станцыі абезжалезвання ў вырашэнні воднага пытання, карэспандэнт «Звязды» высвятляла ў спецыялістаў.**

СТАР. 7

З першых вуснаў

# «НАМ СУПАКОЙВАЦЦА НІ Ў ЯКІМ РАЗЕ НЕЛЬГА»

**Учора Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з генеральным пракурорам Андрэем Шведам. На парадку дня — актуальныя пытанні аховы правапарадку ў краіне. Галоўным пытаннем кіраўнік дзяржавы назваў дадатковыя меры па ўмацаванні ролі пракуратуры Беларусі ў забеспячэнні законнасці і правапарадку.**

### «ГЭТА ТЭМА НЕ ПРОСТА ПАВІННА ГУЧАЦЬ»

Кіраўнік дзяржавы і генеральны пракурор таксама абмеркавалі расследаванне генацыду супраць савецкіх людзей на тэрыторыі Беларусі, супраць беларусаў. «Гэта тэма не проста павінна гучаць. Наша пакаленне павінна паказаць, што адбывалася ў сярэдзіне мінулага стагоддзя ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Зразумела, што замоўчвалі, было шмат палітыкі. Але загінулі мільёны людзей і ў гэтых мільёнаў людзей жывыя сваякі. І яны хочуць ведаць праўду», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Паводле яго слоў, увесь свет павінен ведаць, што адбывалася. Асабліва ў дадзенай сітуацыі, падчас гібрыднай вайны, якую яны супраць нас развязалі.

«Яны як былі нацыстамі, так і засталіся, толькі зусім іншыя формы. Нягоднікі, агідныя людзі. На прыкладзе Літвы відаць, яны нас душаць і патрабуюць ад нас, каб на апошнім уздыху, вобразна кажучы, мы іх абаранялі. Таму нам супакойвацца ні ў якім разе нельга», — падкрэсліў беларускі лідар. Аляксандр Лукашэнка падзякаваў усім, хто працуе над згаданай тэмай.

### «НАШ АБАВЯЗАК — АБАРАНІЦЬ ГЭТЫХ ЛЮДЗЕЙ»

Прэзідэнт пацікавіўся пытаннямі барацьбы са злачыннасцю, асабліва ў інтэрнэце. «Людзі павінны быць пільныя. Не трэба весціся на рознага кшталту прапановы. Асабліва людзям старэйшага пакалення... Наш абавязак — абараніць гэтых людзей», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

Таксама Аляксандр Лукашэнка спытаў, што яшчэ нацырожвае пракуратуру. «Якая сітуацыя праз год пасля гэтых ачумелых, якія бліцкрыг хацелі зрабіць летась? Вашы проста ўражанні ў гэтым плане», — спытаў ён. Прэзідэнт пацікавіўся, як ідзе работа над шэрагам крымінальных спраў і па пытаннях, якія знаходзяцца на кантролі ў кіраўніка дзяржавы.

Андрэй Швед далажыў, што крымінагенная абстаноўка ў краіне знаходзіцца пад кантролем праваахоўных органаў. «Варта адзначыць шэраг станоўчых тэндэнцый. У першым паўгоддзі адбылося зніжэнне колькасці забойстваў на 5 %, разбояў на 6 %, цяжкіх цялесных пашкоджанняў на 11 %, згвалтаванняў на 20 % стала менш. Ды і ў цэлым, пацярпелых ад злачынных замахаў у першым паўгоддзі ў параўнанні з папярэднім перыядам мінулага года стала менш амаль на 14 %», — расказаў ён.

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам **генеральны пракурор Андрэй ШВЕД** расказаў журналістам, пра што канкрэтна дакладваў кіраўніку дзяржавы.

У прыватнасці, ён расказаў пра меры, якія прымаюцца Генеральнай пракуратурай і праваахоўнымі органамі, па актывізацыі барацьбы з нарказлачыннасцю. У першым паўгоддзі такіх злачынстваў выяўлена на 20 працэнтаў больш. Андрэй Швед акцэнтаваў увагу на тым, што амаль на 30 працэнтаў больш выяўлена фактаў збыту наркотыкаў. На дзевяць працэнтаў знізілася бытавая злачыннасць.

«Даложана аб выніках праведзеных органамі пракуратуры маштабных праверак, звязаных з абаронай правоў непаўналетніх, з прафілактыкай гібелі людзей на вадзе, аб выніках праверкі рэалізацыі дзяржаўнай інавацыйнай праграмы, аб фактах масавых грубых парушэнняў у рабоце лізінгавых кампаній і шэрагу іншых маштабных праверак», — расказаў генеральны пракурор.

### ПРЫНЦЫП НЕПАЗБЕЖНАСЦІ ПАКАРАННЯ

Асобна кіраўнік пракуратуры расказаў пра меры, якія прымаюцца па супрацьдзеянні экстрэмізму і тэрарызму ў Беларусі. На сёння распачата больш за 4200 крымінальных спраў. У суды накіравана 803 крымінальныя справы ў дачыненні да 1116 чалавек. Разгледжаны 704 крымінальныя справы ў дачыненні да 955 асоб. «З улікам абставін справы і іншых фактараў вінаватыя прыцягваюцца, як правіла, да строгай крымінальнай адказнасці. Гэта звязана у тым ліку з рэалізацыяй прынцыпу непазбежнасці адказнасці. Асобна сказана аб мерах па ўстанаўленні асоб, якія ўчынілі злачынствы, і пошуку тых асоб, якія збеглі за мяжу. Мы адзначаем станоўчыя вынікі і ў гэтым кірунку, у тым ліку звязаныя з выдачай асоб у першую чаргу з Расійскай Федэрацыі, якія праходзяць па шэрагу крымінальных спраў у якасці абвінавачаных. Крымінальныя справы ў дачыненні да іх будуць накіраваныя ў суды», — канстатаваў Андрэй Швед.

Генеральны пракурор закрануў рэзанансныя справы, звязаныя са спробай дзяржаўнага перавароту летась. «Даложана аб наяўнасці бясспрэчнай доказнай базы па тых справах, якія цяпер знаходзяцца ў судах, і па тых крымінальных справах, якія знаходзяцца на стадыі завяршэння папярэдняга расследавання. Доказы, якія прад'яўляюцца суду, на сёння адпавядаюць цалкам усім патрабаванням, што прад'яўляюцца крымінальна-працэсуальным законам да крыніц доказаў», — падкрэсліў Андрэй Швед.

### СПРАВА АБ ГЕНАЦЫДЗЕ

Генеральны пракурор расказаў журналістам, як праходзіць расследаванне генацыду савецкіх людзей на тэрыторыі Беларусі падчас Вялікай Айчыннай вайны. «Намі дапытана больш за чатыры тысячы сведак. Устаноўлены прозвішчы звыш 400 карнікаў, якія пражываюць у 13 краінах. Выяўлена больш за 100 новых месцаў масавых пахаванняў мірных грамадзян. У гэтых месцах у гады Вялікай Айчыннай вайны пахаваны тысячы, а дзесяці нават і 15–20 тысяч беларускіх грамадзян», — сказаў ён.

Андрэй Швед падкрэсліў, што работа ў гэтым кірунку актыўна працягваецца сумесна са Следчым камітэтам, органамі ўнутраных спраў. «Мы працуем у архівах Расійскай Федэрацыі, нашых спецслужбаў, каб сабраць паўнавартасную доказную базу для прад'яўлення ў міжнародны суд для прызнання факту генацыду беларускага народа», — дадаў пракурор.

Таксама сабраныя новыя пацвярджэнні таго, што бела-чырвона-белая сімволіка выкарыстоўвалася падчас вайны карнымі батальёнамі як абавязковы элемент уніформы. Андрэй Швед расказаў, што завяршаецца падрыхтоўка матэрыялаў для звароту ў Вярхоўны Суд з мэтай прызнання гэтага палатна экстрэмісцкай сімволікай.

Генеральная пракуратура займаецца вызначэннем магчымай матэрыяльнай шкоды, нанесенай Беларусі дзеяннямі фашыстаў і іх памагатых у гады Вялікай Айчыннай вайны. Па словах генеральнага пракурора, пасля вывучэння ўсіх архіўных матэрыялаў, у тым ліку Нюрнберга, можна сказаць, што гэтая сума будзе не меншая за 500 млрд доляраў у цяперашніх цэнах.

«Вядома, для нас, магчыма, не зусім натуральна вызначаць той боль, тыя пакуты людзей у нейкіх эквівалентах, але гэта неабходна рабіць, каб у цэлым абазначыць маштабы трагедыі», — заявіў Андрэй Швед. Ён падкрэсліў, што ў хуткім часе пракуратура падрыхтуе вялікі пакет дакументаў для службовых асоб замежных дзяржаў, дзе будзе расказана пра зверствы фашыстаў і іх памагатых у Беларусі, аб дзейнасці сучасных неанацыстаў.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

# СУПРАЦОЎНІЦТВА НА АСНОВЕ ЎЗАЕМАРАЗУМЕННЯ

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Азербайджанскай Рэспублікі ў Рэспубліцы Беларусь Лаціфам Гандзілавым з нагоды заканчэння яго дыпмісіі ў нашай краіне.**

Прэзідэнт выказаў упэўненасць, што добрыя адносіны паміж нашымі краінамі будуць развівацца, падкрэсліўшы, што Беларусі і Азербайджану ўдалося выбудаваць супрацоўніцтва на аснове ўзаемаразумення. Па яго словах, паміж нашымі народамі вельмі цесныя сяброўскія адносіны, «братэрскія зносіны».

«Вядома ж, вы зрабілі для гэтага нямала. Вы сапраўдны сябар нашага народа і я спадзяюся, што дзе б вы ні працавалі, Беларусь застанецца ў вашым сэрцы. Мы заўсёды вас чакаем. Прыязджайце ў любы час», — звярнуўся кіраўнік дзяржавы да пасла. Беларускі лідар падзякаваў Лаціфу Гандзілаву за разуменне няпростых працэсаў, якія адбываліся і адбываюцца ў Беларусі. Таксама Аляксандр Лукашэнка выказаўся наконт сітуацыі ў Нагорным Карабаху. «Беларусы вельмі перажывалі падчас канфлікту Азербайджана і Арменіі. І дзякуючы пазіцыі Азербайджана і вашага Прэзідэнта, майго добрага сябра, вам удалося стабілізаваць абстаноўку і прыйсці да мірнага ўрэгулявання праблем, якія існавалі. Вядома, шлях да міру толькі пачаўся, і я пра гэта казаў у Азербайджане. Хацелася б, каб гэты шлях быў нядоўгім. Азербайджанскі і армянскі народы заслужылі спакойнае, мірнае жыццё. Мы вельмі хацелі б, каб так было, і я ўпэўнены, што так будзе», — сказаў ён.

Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што Беларусь заўсёды дапаможа Азербайджану. Ён падзякаваў паслу за пастаўку вуглевадароднай сыравіны ў Беларусь. «Вы малайцы, вы не прагнуліся пад ціскам з боку заходніх дзяржаў. Вы трымаеце слова. Як мы дамовіліся, так вы і дзейнічаеце. Гэта дарагога варта ў сучасным свеце. Вы на нас можаце разлічваць. Мы гатовыя рэалізаваць тыя дамоўленасці, якія былі дасягнуты падчас майго нядаўняга візіту ў Азербайджан», — канстатаваў ён.

### КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

#### У НАС НЯМА НЯВЫРАШАНЫХ ЗАДАЧ

Пасля сустрэчы з Прэзідэнтам Лаціф Гандзілаў падзяліўся з журналістамі ўражаннямі аб сваёй дыпламатычнай місіі ў Беларусі. Дыпламат згадаў нядаўні візіт Аляксандра Лукашэнкі ў Азербайджан, падчас якога прэзідэнты краін «зверылі гадзіннікі», прынялі новыя праграмы адносна будучага супрацоўніцтва. «І за апошнія паўтара месяца чатыры дэлегацыі з Азербайджана ўжо былі тут. Гэта сведчыць аб тым, што мы не адкладваем на потым, а адразу ажыццяўляем дамоўленасці. У нас няма нявырашаных пытанняў і праблем», — дадаў ён.

Лаціф Гандзілаў падзяліўся, што Беларусь назаўсёды ў яго сэрцы. «У мяне застанецца ў памяці беларускі народ — вясёлы, спагадлівы, таварыскі, з якім нас звязваюць доўгая гісторыя і добрыя адносіны на працягу 30 гадоў. І гэта стварае для нас магчымасці глядзець наперад з надзеяй», — сказаў пасол.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

## СУСТРЭЧА З УЛАДЗІМІРАМ МАКЕЕМ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з міністрам замежных спраў Уладзімірам Макеем, перадае БелТА.**

Кіраўнік знешнепалітычнага ведамства коратка далажыў Прэзідэнту аб выніках праведзенага на мінулым тыдні ў Мінску семінара кіраўнікоў дыпламатычных прадстаўніцтваў і консульскіх устаноў Беларусі. Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Макей таксама абмеркавалі ўзаемадзеянне з асноўнымі гандлёва-эканамічнымі партнёрамі, графік маючых адбыцца міжнародных мерапрыемстваў і яго змяненні ва ўмовах пандэміі.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Прэзідэнт Туніса адправіў у адстаўку прэм'ера і замарозіў дзейнасць парламента

Каіс Саід адправіў у адстаўку прэм'ер-міністра краіны Хішама Машышы і замарозіў работу мясцовага парламента — Асамблеі народных прадстаўнікоў, паведаміла ТАСС. Апроч адхілення прэм'ера, дзяржаўны лідар таксама пазбавіў парламентарыяў недатыкальнасці і забараніў спікеру пакідаць краіну. Ён падпісаў адпаведныя ўказы на фоне хвалі антыўрадавых масавых акцый, якія прайшлі ў краіне ў 64-ю гадавіну незалежнасці Туніса. Пратэстоўцы патрабавалі выкаранення карупцыі, роспуску парламента і прыцягнення да адказнасці вінаватых у пагаршэнні сітуацыі з пандэміяй каранавіруса. «Мы прынялі гэтыя рашэнні, і будзем прымаць новыя — у форме ўказаў, прадугледжаных Канстытуцыяй, да таго часу, пакуль у Туніс не вернецца грамадская згода і пакуль мы не выратуем дзяржаву», — заявіў прэзідэнт. Пасля рашэнняў палітыка ў сталіцу Туніса ўвялі ўрадавыя войскі. Вайскоўцы размясціліся ў цэнтры горада, ваенная тэхніка акружыла будынак парламента. Туніс займае адно з першых месцаў у свеце па колькасці ахвяр COVID-19. Медыцынская сістэма дзяржавы не справілася з перагрузкамі падчас пандэміі. Улады прызналі, што краіна апынулася не гатовая да пагаршэння эпідэмічнай сітуацыі, і паабяцалі, што кіраваць крызісам будзе армія.

### З-за наступлення талібаў амаль на ўсёй тэрыторыі Афганістана ўведзена каменданцкая гадзіна



Міністэрства ўнутраных спраў Афганістана абвясціла аб увядзенні каменданцкай гадзіны ў 31 з 34 правінцый краіны. Пра гэта паведаміла выданне Ariana News, са спасылкай на намесніка прэс-сакратара МУС ІРА Ахмада Зія Зія. «Каменданцкая гадзіна была ўведзена, каб прадухіліць перамяшчэнне талібаў. Абмежаванні пачнуць дзейнічаць з 22.00 і сконначацца ў 4.00», — адзначаецца ў паведамленні. «Талібан» у апошнія тыдні актывізаваў наступленне на ўрадавыя войскі па меры таго, як краіну пакідаюць вайскоўцы арміі ЗША. Раней талібы заявілі, што кантралююць ужо 90 % граніцы Афганістана і 80 % яго тэрыторыі. Урад у Кабуле назваў гэтыя сцвярджэнні лжывымі. Паводле незалежных ацэнак, экстрэмісты кантралююць каля паловы тэрыторыі краіны і шэраг важных пагранічных пераходаў на граніцах з Іранам, Пакістанам, Туркменістанам і Таджыкістанам.

### У ЗША за тыдзень у перастрэлках забіта больш чым 400 чалавек

У Злучаных Штатах з 17 да 23 ліпеня загінула не менш за 430 чалавек і больш за тысячу атрымала раненні, паведаміў часопіс Slate. Паводле даных архіва пра гвалт з ужываннем агнястрэльнай зброі, сёлета ўжо загінулі 800 чалавек, маладзейшых за 18 гадоў, і 174, маладзейшыя за 12 гадоў. За мінулы год у краіне зарэгістравана больш чым 43 тысячы смерцяў ад агнястрэльнай зброі. Мяркуецца, што сёлета колькасць ахвяр можа ўзрасці, улічваючы што ўжо загінула больш за 24 тысячы чалавек.

Спажывец

# ПАНДЭМІЯ ПАДКАРЭКЦІРАВАЛА КАНТРОЛЬ. АЛЕ НЕ СТАНДАРТЫ

## Сёлета правяраючыя органы сталі больш увагі аддаваць рабоце інтэрнэт-магазінаў

**За першае паўгоддзе гэтага года Дзяржстандарт правёў 5259 кантрольна-наглядных мерапрыемстваў (з іх 689 праверак) па выкананні патрабаванняў тэхнічных рэгламентаў, тэхнічных нарматыўных прававых актаў і абавязковага пацвярджэння адпаведнасці. Як адзначыў намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па стандартызацыі Беларусі Аляксандр БУРАК, колькасць такіх мерапрыемстваў павялічылася прыкладна на 10 % у параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года.**

По выніках праведзеных праверак быў забаронены ўвоз у нашу краіну амаль 900 найменняў небяспечнай прадукцыі. Сярод іх кандытарскія вырабы, мясныя, агароднінныя і рыбныя кансервы, свяцільні, лямпы, пражэктары, зарадныя прылады, выданні для дзяцей, дзіцячае адзенне і абутак, жаночае і мужчынскае адзенне, цацкі і іншыя спажывецкія тавары. Што датычыцца суадносін асноўных відаў прадукцыі, забароненых да ўвозу і абароту, то 33 % з іх заняла харчовая прадукцыя, 31 % — электратэхніка, 16 % — тавары для дзяцей, 7 % — тавары лёгкай прамысловасці, 6 % — сродкі індывідуальнай аховы і 5 % — цацкі.

За шэсць месяцаў кантралёрамі выдадзены 4273 прадпісанні аб ліквідацыі парушэнняў. Была прыпынена работа 212 гандлёвых аб'ектаў, з іх 8 інтэрнэт-крам. У кантралюючых органаў не стала мэта закрыць дадзеныя аб'екты, проста меры папераджальна-прафілактычнай накіраванасці па такіх пунктах не далі станоўчага эфекту, а выяўленыя парушэнні па наяўнасці забароненай прадукцыі не былі ліквідаваныя.

Варта адзначыць і асаблівасці гэтага года. Каранавірус і пандэмія змянілі перавагі спажыўцоў. Цяпер распаўсюдзілася новая тэндэнцыя — узрасла колькасць дыстанцыйных продажаў. З прычыны гэтага наглядныя органы Дзяржстандарта звяртаюць асаблівую ўвагу на работу інтэрнэт-крам. Так, за



першае паўгоддзе абласнымі інспекцыямі камітэта былі праведзены 853 маніторынгі інтэрнэт-магазінаў. Па іх выніках выдадзены 763 прадпісанні па ліквідацыі выяўленых парушэнняў, прыпыненая работа 10 інтэрнэт-сайтаў.

### Айчынныя школьныя тавары бяспечныя

Па словах **намесніка начальніка інспекцыі Дзяржстандарта па Мінскай вобласці і горадзе Мінску Наталлі БАЛДАК,** па выніках праведзенай работы быў забаронены ўвоз і абарот на тэрыторыі Беларусі 48 найменняў імпартнай небяспечнай прадукцыі для дзяцей і падлеткаў школьнага ўзросту, спынена дзеянне на тэрыторыі краіны 35 дакументаў аб ацэнцы пацвярджэння адпаведнасці, выдадзены прадпісанні аб прыпыненні работы 105 гандлёвых аб'ектаў.

Разабрацца ва ўсіх тонкасцях бывае цяжка, таму наш эксперт дае некалькі практычных парад. Па-першае, пры выбары тавараў для дзяцей трэба ўважліва вывучаць маркіроўку незалежна ад таго, дзе дадзеная рэч набываецца. У маркіроўцы ўтрымліваецца шмат карыснай інфармацыі, напрыклад, аб саставе тканіны, рэкамендацыі па доглядзе за вырабам, аб матэрыялах верху і падшэўкі абутку. Наяўнасць у маркіроўцы знака ЕАС сведчыць, што прадукцыя прайшла пацвярджэнне адпаведнасці і бяспечная для выкарыстання.

### Шкодная цацка

А вось днямі ў Магілёве канфіскавалі з продажу траўманебяспечныя наборы цацак з пісталетамі.

Падчас праверкі аднаго з індывідуальных прадпрымальнікаў у продажы былі выяўлены наборы цацак для дзяцей ад 3 гадоў з маркіроўкай «Гуляем разам». Усе цацкі імпартнай вытворчасці. Выяўленая прадукцыя не адпавядае патрабаванням тэхнічнага рэгламенту Мытнага саюза «Аб бяспецы цацак» па паказчыках бяспекі, што прад'яўляюцца да цацак са снарадамі.

«Снарад, які выпускаецца пры дапамозе пускавога механізму і валодае кінетычнай энергіяй, павінен мінімізаваць рызыку траўміравання дзіцяці і таго, хто побач з ім. Прысоскі, якія выконваюць змякчальную функцыю пры стрэле, павінны быць шчыльна замацаваныя і не аддзяляцца ад пластыкавай асновы. Падчас выпрабаванняў было ўстаноўлена, што прысоскі аддзяляліся, чым стваралі магчымасць траўміравання», — падкрэсліла ў абласной інспекцыі. Пасля гэтага Дзяржстандарт забараніў увоз і абарот такой прадукцыі на тэрыторыі нашай краіны.

### Пазбягайце «шэрых» рынкаў

А яшчэ Аляксандр Бурак параіў нашым людзям наогул абмінаць неафіцыйныя гандлёвыя пункты, дзе атрымаць няякасны тавар — шанцы значна вышэйшыя. На яго думку, найбольш рызыкоўным у адносінах да набыцця няякаснага тавару, які не адпавядае патрабаванням, з'яўляецца такі сегмент гандлю, як рынкі, кірмашы і стыхійныя пункты.

Часам менавіта туды перацякае выяўленая небяспечная прадукцыя (з падобным Дзяржстандарт таксама актыўна змагаецца). Парушэнні, якія выяўляюцца ў дадзеным сегменце, практычна не сустракаюцца ў арганізацыях буйных рытэйлараў, крамах, гандлёвых цэнтрах. Таму, выбіраючы тавар у пунктах нестацыянарнага гандлю, варта памятаць пра павышаныя рызыкі куплі неадпаведнай прадукцыі. Там тавар сапраўды можа быць таннейшы, але можа аказацца небяспечнай падробкай.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Надвор'е

# ГАРАЧЫНЯ, ТРЭЦЯЯ ХВАЛЯ...

## У апошнія дні ліпеня тэмпература зноў звыш 30 цяпла

**Гэтае лета сапраўды на адрэзкі паддае пары. Першая хваля гарачыні, якая назіралася з 18 да 26 чэрвеня, аказалася самай моцнай сёлета — у шэрагу дзён максімумы тэмпературы на большай частцы тэрыторыі краіны дасягалі адзнак плюс 35 градусаў і вышэй, а максімальная тэмпература паветра ў гэты перыяд склала плюс 37,1, што і стала новым рэкордам для чэрвеня. Другі перыяд назіраўся ў пачатку ліпеня і стаў больш працяглы (11 дзён), але менш інтэнсіўны. Максімальная тэмпература тады была плюс 35,5 градуса.**

**З гэтага тыдня на тэрыторыю краіны «запаўзае» чарговы перыяд гарачага надвор'я, які, аднак, чакаецца менш інтэнсіўны і працяглы, чым першы і другі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра гідраметэаралогіі, кантролю радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**



Чакаецца, што пачнецца трэцяя хваля з кароткачасовых дажджоў. Напрыклад, заўтра франтальны раздзел працягне перамяшчацца па тэрыторыі краіны. На большай частцы Беларусі чакаюцца кароткачасовыя дажджы, у асобных раёнах моцныя дажджы, месцамі навальніцы. Вецер будзе паўднёва-ўсходні з пераходам на заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 15 да 20 цяпла. Удзень паветра прагрэецца да 23—29 градусаў са знакам плюс, у асобных раёнах — да 30—31 цяпла.

А далей чарга гарачыні. У чацвер месцамі па краіне пройдуць кароткачасовыя дажджы, прагрымяць навальніцы. Вецер будзе заходні, паўднёва-заходні ўмераны, пры навальніцах парывісты. Тэмпература паветра ўначы складзе плюс 13—20 градусаў. Удзень слупок тэрмометра паднімецца да 24—30 градусаў, а па паўднёвым усходзе краіны — да 32 градусаў цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у пятніцу трэцяя хваля цяпла прыпыніцца па паўночнай частцы Беларусі. У гэты дзень месцамі па краіне таксама прагназуюцца кароткачасовыя дажджы, навальніцы. Тэмпература паветра ноччу будзе 14—19 цяпла, удзень — 25—32 са знакам плюс, па паўночным захадзе — 22—24 градусы.

Што будзе ў выхадныя? Час пакажа.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Абітурыент-2021

# Хто не паспеў — той спазніўся

## Але на гэтым шанцы стаць студэнтам не заканчваюцца

**Учора айчынныя ВНУ завяршылі прыём дакументаў ад абітурыентаў на бюджэтныя месцы.**

Вызначыцца з выбарам спецыяльнасці для паступлення на бюджэт сёлета абітурыенты маглі з 20 да 26 ліпеня. Прыём дакументаў ад абітурыентаў, якія выразшылі атрымліваць адукацыю на платнай аснове і не будуць здаваць уступныя іспыты непасрэдна ў ВНУ, будзе прадаўжацца да 9 жніўня.

Унутраныя ўступныя іспыты пройдуць з 27 ліпеня да 4 жніўня. Залічэнне на бюджэт завершыцца 5 жніўня,



на платную форму навучання — 11 жніўня.

Агульны план прыёму ў 50 установ вышэйшай адукацыі (42 дзяржаўныя і 8 прыватных) сёлета складае каля 54,9 тысячы чалавек.

Установы адукацыі, якія ажыццяўляюць падрыхтоўку на ўзроўні сярэдняй спецыяльнай адукацыі, прадаўжаюць прыём дакументаў ад абітурыентаў. Прыём дакументаў на аснове агульнай базавай адукацыі, гэта значыць ад абітурыентаў, якія скончылі 9 класаў, на навучанне за кошт сродкаў бюджэту будзе ажыццяўляцца да 3 жніўня, на платнай аснове — да 14 жніўня. Але трэба мець на ўвазе, што тыя абітурыенты, якія будуць здаваць унутраныя ўступныя іспыты на творчыя спецыяльнасці і іншыя, павінны падаць дакументы таксама да 3 жніўня, папярэджвае БелТА. Самі ўступныя іспыты пройдуць з 4 да 8 жніўня. Залічэнне на бюджэт пройдзе да 10 жніўня, на платную аснову — да 16 жніўня.

Прыём дакументаў на аснове агульнай сярэдняй адукацыі, гэта значыць ад абітурыентаў, якія скончылі 11 класаў, або асоб, якія атрымалі прафтэхадукацыю з агульнай сярэдняй, будзе ажыццяўляцца за кошт сродкаў бюджэту да 12 жніўня, на платнай аснове — да 17 жніўня. Для абітурыентаў, якія будуць здаваць унутраныя ўступныя іспыты, будзе працаваць такая ж схема. Нават на платную форму ім трэба падаць дакументы да 12 жніўня. Унутраныя ўступныя іспыты пройдуць з 13 да 15 жніўня. Залічэнне на навучанне за кошт сродкаў бюджэту пройдзе да 16 жніўня, на платнай аснове — да 18 жніўня.

У цэлым на ўзровень сярэдняй спецыяльнай адукацыі прыём будуць ажыццяўляць 110 устаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі — каледжаў, з іх 9 — прыватнай формы ўласнасці, а таксама 84 установы адукацыі, якія рэалізоўваюць адукацыйныя праграмы сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Тут маюцца на ўвазе філіялы ВНУ — каледжы і іншыя ўстановы. План прыёму для атрымання сярэдняй спецыяльнай адукацыі складае сёлета каля 39,6 тысячы чалавек.

Перспектыва

# Стаўка на імпартазамяшчэнне

**У гарадскім пасёлку Коханава, што ў Талачынскім раёне, адбылося ўрачыстае адкрыццё мадэрнізаванага прадпрыемства «Амкадор-КЭЗ», якое ўваходзіць у склад холдынга «Амкадор». Ва ўрачыстай цырымоніі ўзялі ўдзел прэм'ер-міністр Раман ГАЛОЎЧАНКА, члены ўрада, кіраўнікі дзяржаўных прадпрыемстваў, дыпламаты.**

Вытворчая лінейка «Амкадор-КЭЗ» уключае сёння 11 найменняў. Прадпрыемства заснавана ў 1974 годзе, першапачаткова яно спецыялізавалася на абслугоўванні і рамонце экскаватараў, а цяпер гэта сучасны завод, які выпускае машыны будучыні. З 2013-га прадпрыемства ўвайшло ў склад холдынга «Амкадор». І з таго моманту планамерна праводзілася яго мадэрнізацыя. Тут былі распрацаваныя і прынятыя да вытворчасці запатрабаваныя на рынку мадэлі сучаснай тэхнікі. «Амкадор-КЭЗ» з'яўляецца адзіным у краіне вытворцам меліярацыйных машын і аднакаўшовых гідраўлічных экскаватараў на гусенічным і колавым хаду, траншэекапальнікаў, гусенічных бульдозераў і іншых спецыялізаваных машын. Тэхніка коханаўскага завода здольная працаваць у балоцістай мясцовасці і на слабых грунтах.

Прэм'ер-міністр азнаёміўся з навінкамі вытворчасці, у тым ліку з тымі, што сышлі з канвеера ўжо сёлета ў чэрвені, распытаў спецыялістаў прадпрыемства аб перавагах тэхнікі і яе прадукцыйнасці. Трэба адзначыць, што аналагаў некаторым беларускім мадэлям у свеце няма.

Прэм'ер-міністр на ўласным вопыце даведаўся, наколькі камфортна адчуваюць сябе вадзіцелі такіх машын. Раман Галоўчанка пратэсціраваў і першы ў Беларусі гусенічны экскаватар з каўшом аб'ёмам 1 куб. м. Гэтая машына сышла з канвеера зусім нядаўна, у час дэманстрацыйнага паказу на прадпрыемстве адбыўся яе дэбют. Машына будзе выкарыстоўвацца ў прамысловым, жыллёвым і дарожным будаўніцтве, сельскай гаспадарцы, а таксама пры правядзенні меліярацыйных работ. Новы экскаватар можа распрацоўваць мёрзлы грунт, а таксама папярэдне разрыхленыя мёрзлыя і скальныя пароды. Магутныя бульдозеры, зробленыя ў Коханаве, могуць быць задзейнічаны як у будаўніцтве, так і на тушэнні пажараў. Работу гэтых машын паказалі на выпрабавальным палігоне прадпрыемства. Майстэрства кіроўцаў-выпрабавальнікаў неаднойчы выклікала апладысменты.



Раман ГАЛОЎЧАНКА ў кабіне новай машыны.

Адразу па заканчэнні паказу **генеральны дырэктар ДУ «Аб'яднанне Мінскмеліяводгас» Дзмітрый Мірчук** і **генеральны дырэктар ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» Аляксандр ЯФІМАЎ** падпісалі пагадненне аб пастаўцы тэхнікі меліярацыйным прадпрыемствам Мінскай вобласці.

— Наш холдынг падзяліўся на пяць дывізіёнаў, сфарміраваны пяць асобных кірункаў дзейнасці: будаўнічыя машыны, машыны для лясной галіны, сельскагаспадарчыя машыны, тэхніка для камунальнай гаспадаркі, а таксама вытворчасць кампанентнай базы для ўсіх відаў тэхнікі, — паведаміў журналістам пасля заканчэння мерапрыемства генеральны дырэктар ААТ «Амкадор» — кіруючая кампанія холдынга» Аляксандр Яфімаў. — Мы ствараем не проста машыны, а цэлыя вытворчыя комплексы. Напрыклад, у складзе дарожнабудаўнічай тэхнікі ў нас ёсць увесь рад дарожных машын, за выключэннем асфальтаўкладчыкаў. Мы пашыраем вытворчасць разнастайнай тэхнікі не толькі па вытворчых плошчах, але і па навукова-тэхнічным патэнцыяле. Напрацоўваем новыя кампетэнцыі. Наша галоўная мэта — замясціць большасць імпартнага абсталявання сучаснымі, надзейнымі, інавацыйнымі, высокапрадукцыйнымі машынамі на сусветным узроўні, якія адказваюць усім сучасным патрабаванням. Яны павінны быць даступныя як па цане, так і па кошце абслугоўвання. Сваім спажыўцам мы ствараем найлепшыя ўмовы выкарыстання.

Мы не стаім на месцы, а ўвесь час развіваемся. Але галоўная наша мэта — гэта, безумоўна, імпартазамяшчэнне. Нагадаю, што сёння тэхніка «Амкадора» забяспечана сваімі вузламі як мінімум на 75 %. А на некаторых машынах узровень лакалізацыі складае больш за 90 %. Гэта — заслуга ўсяго нашага працоўнага калектыву, чым мы ўсе ганарымся. Мы здольныя паспяхова канкурыраваць з найлепшымі замежнымі мадэлямі.

Сёння была прадстаўлена шырокая лінейка навінак нашага холдынга. Унікальнасць гэтай сучаснай тэхнікі ў тым, што яна ніяк не адрозніваецца ад тэхнікі вядомых замежных вытворцаў. Такія мадэлі не выпускае ніводная з постсавецкіх краін. Мы, можна сказаць, напоўнілі рынак ЕАЭС, абмежавалі замежны імпарт, захавалі валюту ў краіне.



Дэманстрацыя магчымасцяў тэхнікі.

— У мадэрнізацыю нашага прадпрыемства холдынг уклаў больш за 25 мільёнаў беларускіх рублёў, — падкрэсліў **дырэктар «Амкадор-КЭЗ» Аляксандр КАЗЛОЎ**. — Але галоўнае, што кіраўніцтва холдынга ў нас паверыла. Цяпер вытворчыя памяшканні адрамантаваныя, тут працуе новае тэхналагічнае абсталяванне. А гэта — высокая прадукцыйнасць, новыя рабочыя месцы, добрая зарплата і гэтак далей. Але самая галоўная праблема нашага пасёлка, ды і ўсяго Талачынскага раёна, — высокакваліфікаваныя працоўныя кадры. На жаль, застаецца ў глыбінцы моладзь у асноўным не рашаецца.

А мы гатовыя вучыць маладых людзей прафесіям непасрэдна на прадпрыемстве, накіроўваць іх у спецыялізаваныя навучальныя ўстановы, забяспечваць добрыя ўмовы працы і высокі заробак. Паспрабуем зацікавіць іх і іншым чынам, у прыватнасці жыллём. Дэфіцыт кадраў пакуль не дазваляе нам павялічыць вытворчасць прадукцыі. А ў нас на самых новыя мадэлі тэхнікі, нават перадсерыйныя, ужо ёсць заказчыкі. Каб павялічыць вытворчасць прадукцыі, мы гатовыя працаваць у тры працоўныя змены. У нашага прадпрыемства вялікі патэнцыял, таму мы глядзім у будучыню з аптымізмам.

**Сяргей РУЧАНАЎ.**
**Фота аўтара.**

# СЛУЖБА ПАСТАЯННАЙ ГАТОЎНАСЦІ

**У сталічным парку імя Максіма Горкага адзначалі 168-ю гадавіну пажарнай службы Беларусі. Святочныя мерапрыемствы пачаліся з ускладання кветак да манумента Перамогі, у якім прыняў удзел міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім СІНЯЎСКІ.**

Затым адбыўся ўжо традыцыйны парад тэхнікі і падраздзяленняў МНС, дзе ўдзельнічала больш за 500 чалавек, 23 рэтрааўтамабілі і некалькі дзясяткаў сучасных адзінак тэхнікі, што стаіць на ўзбраенні МНС. Адкрывалі шэсце сцяганосцы і ўзвод ганаровай варты Універсітэта грамадзянскай абароны МНС. Услед за імі па цэнтральным праспекце сталіцы ўрачыста прайшлі разлікі ратавальнікаў-пажарных у амуніцыі розных эпох, пачынаючы ад абмундзіравання пазамінулага стагоддзя да сучаснай экіпіроўкі МНС, а таксама прадстаўнікі добраахвотнага пажарнага грамадства, ветэраны службы выратавання, спартсмены і юныя ратавальнікі з розных куткоў краіны.

Каленчатыя пад'ёмнікі, грузавыя краны, аварыйна-выратавальныя аўтамабілі, аўтамабілі дымавыдалення, мабільны вадалазны комплекс, аўтамабіль радыяцыйнай абароны, выбухова-тэхнічнай службы, колавы цягач з перапампоўвальнай станцыяй, аўтамабіль-рэанімацыя, снегабалатаход «Шэрп» — гэта далёка не ўся тэхніка, якая ёсць на ўзбраенні ў сучасных ратавальнікаў і якую змаглі ўбачыць падчас парада гледачы.



Міністр МНС В. СІНЯЎСКІ ўзнагароджвае лепшых.



Рэтратэхніка на парадзе.

Далей святочныя мерапрыемствы перамясціліся ў парк імя М. Горкага, дзе для пачатку курсанты Універсітэта грамадзянскай абароны МНС прадэманстравалі пляц-канцэрт у суправаджэнні духавога аркестра Мінскага гарадскога УМНС.

Быў дадзены старт дэманстрацыі сіл і сродкаў на вадзе, а таксама паказальным выступам вадалазаў-ратавальнікаў. Людзі змаглі ацаніць парк плавальных сродкаў МНС: маторныя лодкі, катары, а таксама ўбачыць відовішчнае воднае шоу з гідрацыкламі і палётамі на флайбордзе. Фінальным акордам шоу стала водная феерыя ад ратавальнікаў.

На цэнтральнай канцэртнай пляцоўцы ў парку разгарнуўся святочны канцэрт. Міністр па надзвычайных сітуацыях Вадзім Сіняўскі павіншаваў калег са святам.

— Сёння свята — Дзень пажарнай службы, — сказаў ён. — Шмат гадоў таму, калі ўтваралася служба, — гэта было добраахвотнае таварыства людзей, якія проста аказвалі дапамогу пры тушэнні пажараў. А сёння МНС — гэта высакакласныя прафесіяналы сваёй справы, забяспечаныя сучаснай тэхнікай, экіпіроўкай, гатовыя прыйсці ў любую хвіліну на дапамогу. МНС — гэта служба пастаяннай гатоўнасці.

Усіх прысутных павіншавалі афіцэры МНС, выканаўшы песні ўласнага сачынення, ветэраны выратавальнай службы, курсанты, юныя ратавальнікі і дзеці работнікаў МНС, а таксама да віншаванняў далучылася заслужаная артыстка Беларусі Ірына Дарафеева.

У гэты дзень у парку разгарнуліся розныя забаўляльныя і навучальныя інтэрактыўныя пляцоўкі для дзяцей і дарослых, дзе можна было не толькі весела правесці час, але і ўспомніць правілы бяспекі жыццядзейнасці, атрымаць падарункі, карысную літаратуру, размалёўкі і налепкі ад МНС. У конкурсах можна было паўтарыць пяць крокаў на выратаванне, высветліць, хто самы трапны пажарны, даведацца, як правесці час з карысцю, успомніць «Азбуку бяспекі», згуляць у пажарны боўлінг, паўдзельнічаць у чэмпіянаце па бяспецы, паспаборнічаць у надзяванні баявога адзення, замацаваць навыкі выкліку ратавальнікаў і іншых актыўнасцях.

Таксама ўсе жадаючыя мелі магчымасць прымерыць баявую вопратку, пасядзець у машыне ратавальнікаў, сфатаграфавацца з лабрадорамі кіналагічнай службы МНС, пабываць у сапраўднай дымакамеры, зразумець, што адчувае чалавек у перавернутай машыне, навучыцца рабіць штучнае дыханне і праводзіць рэанімацыйныя мерапрыемствы на спецыяльным манекене.

На стадыёне перад хакейным палацам каманды МНС па пажарна-выратавальным спорце правялі паказальныя выступленні, прадэманстраваўшы гледачам самы відовішчны від — баявое разгортванне. А для тых, каму цікавы спорт, была прадстаўлена выстава спартыўных дасягненняў МНС, дзе можна было ўбачыць кубкі, медалі, граматы і памятныя фатаграфіі з розных стартаў.

Прафесія пажарнага з'яўляецца адной з самых небяспечных. Яна патрабуе сапраўднай мужнасці, высокай самааддачы, смеласці, прафесіяналізму. У ратавальнікаў ёсць толькі адзін прыярытэт — першымі ўступіць у сутычку з вогненным монстрам і перамагчы яго.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

# СКІДКІ, РАСТЭРМІНОЎКІ І ШЫРОКІ АСАРТЫМЕНТ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Гандлёвы дом «На Нямізе» прапануе адзенне дзелавога стылю для хлопчыкаў і дзяўчынак, трыкатажныя вырабы, абутак, канцылярскія тавары ў секцыях на 2-м паверсе ўнівермага. Дадаткова ў комплексе «Тавары для мужчын» на 2-м паверсе арганізаваны продаж школьнага адзення для хлопчыкаў і вучнёўскай галантарэі.

У ГУМе тэматычная секцыя «Тавары для дзяцей» размясцілася на 2-м паверсе, асобна назначана зона тавараў для першакласніка. Павялічана дэманстрацыйная плошча выкладкі кашуль для хлопчыкаў, абутку, устаноўлена дадатковае абсталяванне для пашыранага продажу ранцаў і заплечнікаў. З сярэдзіны жніўня каля цэнтральнай лесвіцы на 2-м паверсе ўнівермага з'явіцца дадатковае гандлёвае месца для рэалізацыі канцылярскіх і школьна-пісьмовых тавараў.

Ва ўнівермагу «ЦУМ Мінск» на 3-м паверсе ў секцыі «Дзіцячы свет» прадстаўлены ўвесь асартымент тавараў да школы. Акрамя таго, рэалізацыя канцылярскіх і папярова-бяловых тавараў, школьна-пісьмовых прылад і вучнёўскай галантарэі дадаткова арганізавана ў гандлёвым павільёне з боку метро, у крамах «Камароўскі» па вул. В. Харужай, 10, і «Тавары для жанчын» па вул. Куйбышава, 75.

*«Вытворцы краіны сёння актыўна пастаўляюць асартымент тавараў для школьнікаў па дагаворах, створаны запасы тавараў для школьнікаў, у тым ліку вытворчасці прамысловых прадпрыемстваў канцэрна «Беллегпрам», — сказалі мне ў* ***дзяржаб'яднанні «Сталічны гандаль і паслугі»****. — Ужо сёння ўнівермагі прапануюць пакупнікам разнастайнае па колеравай гаме і фасонах адзенне для дзяўчынак усіх узроставых груп: сарафаны, блузкі, штаны і спадніцы, пінжакі і камізэлькі — усяго больш за 220 мадэляў; вырабы для хлопчыкаў: касцюмы і камплекты розных груп, пінжакі і камізэлькі, штаны з рэгулятарам таліі, кашулі — каля 200 мадэляў. Дадаткова прапануюцца трыкатажныя вырабы: джэмперы, камізэлькі, жакеты для хлопчыкаў і дзяўчынак — у цэлым звыш 70 мадэляў».*

Да школьнага сезона ва ўнівермагах прадстаўлены шырокі асартымент дзіцячага абутку: каля 70 мадэляў для хлопчыкаў і дзяўчынак школьнага ўзросту.

З улікам вялікага выбару мадэляў і камбінацый арыенціровачны кошт аптымальнай экіпіроўкі школьнікаў малодшых класаў складае ад 266 да 804 беларускіх рублёў, старшакласнікаў — ад 349 да 978 беларускіх рублёў. У такі камплект да навучальнага года ўваходзяць адзенне, абутак, галантарэйныя тавары і школьныя прылады. Для параўнання: у рэгіёнах, на Міншчыне, у прыватнасці, кошт набору неабходных для вучобы прадметаў для вучняў 1-4-х класаў складае ад Br62 да Br314, для 5-9-х класаў — ад Br63 да Br356, для 10-11-х класаў — ад Br79 да Br384.

Пры гэтым бацькам даступныя праграмы растэрміноўкі плацяжу, выкарыстанне карт растэрміноўкі. Шматдзетным сем'ям і грамадзянам, якія маюць патрэбу ў сацыяльнай падтрымцы, ва ўнівермагах пастаянна дзейнічаюць 10-працэнтныя зніжкі. Акрамя таго, рэгулярна праводзяцца дні зніжак са зніжэннем коштаў на ўсе нехарчовыя тавары на 20–35 %.

Тавары школьнага асартыменту беларускай вытворчасці адпавядаюць патрабаванням бяспекі. Абласныя інспекцыі Дзяржстандарта праверылі за апошнія некалькі месяцаў 2300 найменняў прадукцыі для дзяцей і падлеткаў школьнага асартыменту — не толькі айчыннай вытворчасці, але і вытворцаў з Расіі, Кітая, Узбекістана, Казахстана, Кыргызстана, Турцыі, Польшчы і В'етнама. Гаворка ідзе пра абутак, адзенне, панчошна-шкарпэтачныя вырабы, заплечнікі і ранцы, канцылярскія тавары. Патрабаванні да такой катэгорыі прадукцыі ўстаноўлены ў тэхнічным рэгламенце Мытнага саюза «Аб бяспецы прадукцыі, прызначанай для дзяцей і падлеткаў». Парушэнні выяўлены практычна ва ўсіх найменнях прадукцыі. А вось у вырабах айчыннай вытворчасці неадпаведнасці выяўляюцца значна радзей», — адзначыла намеснік начальніка інспекцыі.

Асноўныя парушэнні звязаныя з такімі паказчыкамі бяспекі, як перавышэнне дапушчальнага значэння вышыні абцаса ў абутку, прызначаным для дзяцей малодшага школьнага ўзросту, прымяненне ў закрытым абутку недапушчальнай падэшвы, вусцілкі са штучных і сінтэтычных скур, неадпаведнасць устаноўленым нормам паказчыкаў «паветрапранікальнасць», «гіграскапічнасць» у адзенні для школьнікаў, адсутнасць дэталяў і фурнітуры са святлоадбівальнымі элементамі на вучнёўскіх ранцах і іншыя. Парушэннямі, якімі б дробнымі і нязначнымі яны ні здаваліся б на першы погляд, нельга грэбаваць. У рэшце рэшт гэта — здароўе нашых дзяцей.

**Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.**

## МАТЭРЫЯЛЬНУЮ ДАПАМОГУ ДА НОВАГА НАВУЧАЛЬНАГА ГОДА АТРЫМАЕ АМАЛЬ 100 ТЫСЯЧ СЕМ'ЯЎ

**Напярэдадні новага навучальнага года ва ўсіх рэгіёнах краіны адбудзецца мерапрыемства па аказанні дапамогі бацькам пры падрыхтоўцы дзяцей да школы — праз выдзяленне аднаразовай матэрыяльнай дапамогі, аказанне дзяржаўнай адраснай сацыяльнай дапамогі, правядзенне дабрачынных акцый, а таксама акцый па месцы работы бацькоў, — паведамляе БелТА са спасылкай на Міністэрства працы і сацыяльнай ахоувы.**

Аднаразовая матэрыяльная дапамога аказваецца сем'ям, якія выхоўваюць траіх і больш дзяцей, незалежна ад даходу сям'і.

Максімальны памер выплат на кожнае дзіця школьнага ўзросту дасягае 30 % БПМ, які дзейнічае ў ліпені гэтага года (Br81,9). Суму дапамогі вызначаюць мясцовыя Саветы дэпутатаў у залежнасці ад фінансавых магчымасцяў рэгіёна.

Каб атрымаць гэтыя выплаты, неабходна звярнуцца ў органы па працы, занятасці і сацыяльнай абароне ў адпаведнасці з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (знаходжання) аднаго з бацькоў. А ў Мінску — па месцы вучобы дзіцяці.

«Сёлета плануецца аказаць аднаразовую матэрыяльную дапамогу амаль 100 тысячам сем'яў на 205,7 тысячы дзяцей. Агульная сума выплат складзе больш за 14 мільёнаў беларускіх рублёў», — прывялі лічбы ў Мінпрацы і сацабароны.

**Дзяржаўная адрасная сацыяльная дапамога (ДАСД) прызначаецца для малазабяспечаных сем'яў, якія выхоўваюць непаўналетніх дзяцей (у тым ліку для шматдзетных).**

Яна можа аказвацца ў выглядзе: аднаразовай дапамогі для набыцця адзення, абутку, канцылярскіх прылад, штомесячнай сацыяльнай дапамогі. Памер выплат вызначаецца раённымі камісіямі ў кожным выпадку індывідуальна, зыходзячы з даходу сям'і і канкрэтнай жыццёвай сітуацыі.

Звяртацца па ДАСД варта ў службу «адно акно» або орган па працы, занятасці і сацыяльнай абароне згодна з рэгістрацыяй па месцы жыхарства (знаходжання) аднаго з бацькоў.

Таксама дапамога можа быць аказана на месцы работы бацькоў, якія выхоўваюць дзяцей школьнага ўзросту.

Такая падтрымка, як правіла, агаворана калектыўнымі дагаворамі, іншымі лакальнымі актамі. Акрамя таго, яе аказваюць за кошт сродкаў прафсаюзных арганізацый.

Дадатковая дапамога аказваецца ў рамках дабрачынных акцый.

У ліпені-жніўні па ўсёй краіне праходзяць дабрачынныя акцыі, кірмашы «Школьны ранец», «Збяры дзіця ў школу», «У школу з усмешкай», «Партфель першакласніка» і іншыя, арганізаваныя тэрытарыяльнымі цэнтрамі сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва, дабрачыннымі фондамі і грамадскімі аб'яднаннямі.

У 2020 годзе аднаразовую матэрыяльную дапамогу атрымала 101,5 тысячы шматдзетных сем'яў, дзе выхоўваецца 199,8 тысячы дзяцей, на суму Br11,2 млн. ДАСД аказана 4,9 тысячы малазабяспечаных сем'яў (у тым ліку шматдзетных) на 11,7 тыс. дзяцей на суму Br2,4 млн. А ўсяго разнастайнай дапамогі на падрыхтоўку дзяцей да новага навучальнага года аказана на суму Br20,3 млн.




«Разумныя» канікулы

# НАВУКА + ТВОРЧАСЦЬ + СУПРАЦОЎНІЦТВА

## Летняя школа юных навукоўцаў праходзіць у «Брыганціне»

**Удзел у ёй бярэ каля 200 пераможцаў інтэлектуальных спаборніцтваў ад абласнога ўзроўню да міжнароднага. Заняткі з навучэнцамі праводзяць чатыры дзясяткі выкладчыкаў з розных ВНУ і прадстаўнікі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, сярод якіх дактары і кандыдаты навук, кіраўнікі камандаў Рэспублікі Беларусь на міжнародных алімпіядах, турнірах, канферэнцыях, а таксама студэнты — пераможцы міжнародных спаборніцтваў.**

Падчас знаходжання навучэнцаў у спартыўна-аздараўленчым комплексе «Брыганціна» БДУ хлопцы і дзяўчаты змогуць не толькі адпачыць, але і ўзяць удзел у інтэлектуальных мерапрыемствах — занятках, семінарах, выніковай алімпіядзе і канферэнцыі школы, фізіка-матэматычным баі, інтэлектуальных гульнях, псіхалагічных семінарах і трэнінгах. Запланавана таксама правядзенне круглага стала з найлепшымі ўдзельнікамі і педагогамі, на якім будуць абмеркаваны пытанні далейшага развіцця навукова-даследчага кірунку ў сістэме работы з таленавітай моладдзю.

Адзначым, што першая Летняя навуковая школа была арганізавана 10 жніўня 1995 года ў пасёлку Лужасна Віцебскага раёна. Дзясятая і наступныя арганізоўваліся на базе спартыўна-аздараўленчага комплексу БДУ «Брыганціна». З самага пачатку работы школы сфарміраваліся асноўныя прынцыпы яе дзейнасці: свабодная творчасць, супрацоўніцтва і ўзаемаразуменне, духоўнасць і інтэлігентнасць.

За ўсе гады ў школе прайшло навучанне больш за 4200 навучэнцаў і павысіла кваліфікацыю больш як 390 настаўнікаў з усіх рэгіёнаў Беларусі, а таксама з Расіі, Францыі, Балгарыі і Літвы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ОАО «Строитель-197»

| Лот | Наименование Лота | Начальная стоимость без НДС, BYN | Задаток, BYN | Шаг аукциона, BYN |
|---|---|---|---|---|
| 1 | **Автобус ГАЗ-3307** | 4 900,00 | 490,00 | 245,00 |
| 2 | **Автомашина МАЗ-555142 (белая)** | 6 400,00 | 640,00 | 320,00 |
| 3 | **Автомобиль МАЗ-543205 комплектация 226** | 2 900,00 | 290,00 | 145,00 |
| 4 | **Прицеп 2ПТС-4** | 1 000,00 | 100,00 | 50,00 |
| 5 | **Прицеп тракторный б\н** | 1 000,00 | 100,00 | 50,00 |
| 6 | **Прицеп тракторный самосвальный ПГС-6,5И** | 1 600,00 | 160,00 | 80,00 |
| 7 | **Трактор МТЗ-82** | 5 400,00 | 540,00 | 270,00 |
| 8 | **Экскаватор-погрузчик ЭП-Ф-П** | 10 500,00 | 1050,00 | 525,00 |

В отношении вышеуказанного имущества проводятся первые торги после оценки

| | |
|---|---|
| **Дата и время проведения торгов** | **27 августа 2021 года в 13.00 (регистрация с 12.30 до 13.00)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, дом 1, офис 1127 |
| **Прием заявлений** | **Начало приема заявлений в 10.00 27.07.2021 г. Окончание приема заявлений в 16.00 26.08.2021 г. по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127** |
| **Место-нахождение имущества** | Минская область, г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 |

**Условия для участия в торгах**

1. Перечень документов, прилагаемых к заявлению на участие в торгах, порядок оформления участия в аукционе, критерии выявления победителя торгов и порядок оформления результатов торгов содержатся на сайте **https://orgtorg.by/info.**

2. До подачи заявления необходимо внести задаток на **р/с BY36ALFA 30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: задаток для участия в торгах по Лоту №_, принадлежащему ОАО «Строитель-197», проводимых 27.08.2021. **Срок внесения задатка: с 27.07.2021 в 10.00 по 26.08.2021 в 16.00.**

3. Заявления на участие и необходимые документы принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Контактное лицо по вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе – Анаида (+375 29 308 28 97).

4. Лица, желающие принять участие в аукционе, и выполнившие все требования, допускаются к участию в аукционе посредством выдачи билета участника аукциона, в котором указывается порядковый номер, под которым данное лицо зарегистрировано. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании счета-фактуры и акта в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона. Вознаграждение аукциониста составляет 7,5 % от конечной цены предмета торгов.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 15 (пятнадцати) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 30 (тридцати) календарных дней со дня подписания (заключения) договора купли-продажи. В случае совершения просрочки обязательства по заключению договора купли-продажи и его оплате не по вине Покупателя указанные сроки могут быть продлены.

5. В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %, комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.

6. Все желающие могут предварительно ознакомиться с объектом торгов. По вопросу осмотра объектов обращаться к Александру Владимировичу (+375293697036). По вопросу наличия обременений обращаться к Ольге (+375296471671).

7. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 № 16.

8. Государственная регистрация договора купли-продажи транспортных средств и снятие их с государственного учета осуществляется Покупателем самостоятельно и за свой счет

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | **ООО «Фрондера» 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127: ☎ 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram: https://t.me/orgtorg** |
| **Продавец** | **ОАО «Строитель-197», Минская обл., г. Молодечно, ул. Металлистов, д. 1 (ликвидатор – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375296471671 (Ольга)** |

Печать и Свидетельство о государственной регистрации ООО «Иствилтрейд», УНП 192226625 **считать недействительными в связи с утерей.**

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению антикризисного управляющего ООО «Правовая Стратегия» (220035, г. Минск, ул. Тимирязева, 67, офис 1404) проводит в процедуре экономической несостоятельности (банкротстве) на основании Определения Экономического суда Минской области от 28.04.2021 по делу № 116-13Б/2020/7 вх.9964 открытый повторный аукцион по продаже имущества ОАО «Слуцкий пивоваренный завод» (223610, г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1, УНП 600154343):**

## СООРУЖЕНИЕ С ИНВ. № 640/С-51881, НАИМЕНОВАНИЕ – ГРАДИРНЯ,

**расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009263 (право аренды по 27.02.2039) площадью 0,1097 га по адресу: Минская обл., г. Слуцк, ул. Тутаринова, 1.**

*Земельный участок имеет ограничения (обременения) в использовании: земельный участок, расположенный на природных территориях, подлежащих специальной охране (в зоне санитарной охраны водного объекта, используемого для хозяйственно-питьевого водоснабжения, в зоне санитарной охраны в местах водозабора), пл. 0,1097 га.*

Начальная цена без НДС **– 9 810,00** бел. руб.(задаток 10 % от начальной цены – **981,00** бел. руб.). ***(Цена снижена на 10 %).***

Шаг аукциона – 5 (пять) процентов.

**Задатки (10 % от начальной цены) перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) календарных дней со дня проведения аукциона, если иной срок не будет установлен собранием (комитетом) кредиторов.

Победитель аукциона (единственный участник аукциона) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня проведения аукциона оплачивает вознаграждение, в размере 10 % от цены продажи предмета аукциона и возмещает затраты на публикацию.

**Условия аукциона:**

- имущество приобретается на условиях 100 % предоплаты и оплаты Покупателем (единственным участником) аукциона комиссионного вознаграждения банку за проведения данного платежа;

- Покупатель обязан за свой счет принять приобретаемое имущество, в том числе осуществление вывоза, хранения, погрузочно-разгрузочных работ;

- на Покупателя возлагается обязанность по переоформлению (в ГАИ, военкомате), снятию и постановке на учет приобретаемого имущества за свой счет.

Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов, в указанный в извещении о проведении торгов срок, заявление на участие в торгах с приложением следующих документов:

- заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении о проведении торгов;

- для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя (без нотариального засвидетельствования);

- для юридического лица – доверенности, выданной представителю юридического лица (кроме случаев, когда юридическое лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о государственной регистрации юридического лица (без нотариального засвидетельствования);

- для иностранного юридического лица, иностранной организации, не являющейся юридическим лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юридического лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком (без нотариального засвидетельствования);

- для представителя гражданина Республики Беларусь, в том числе индивидуального предпринимателя, – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством.

При подаче документов на участие в торгах граждане Республики Беларусь, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане Республики Беларусь, постоянно проживающие за пределами Республики Беларусь, в том числе представители юридических лиц Республики Беларусь, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность.

Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену приобретения лота по сравнению с предложениями других лиц.

Участникам, не признанным победителями, задаток возвращается в безналичной форме в течение 5 рабочих дней с даты проведения торгов.

Результаты торгов оглашаются публично в день проведения торгов.

В случае, если торги признаны несостоявшимися в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет торгов продается этому частнику при его согласии по начальной цене, увеличенной на пять процентов.

Организатор аукциона вправе отказаться от их проведения не позднее, чем за пять дней до даты их проведения.

Порядок проведения торгов и оформление участия в торгах определяется Законом Республики Беларусь от 13.07.2012 № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Предыдущие извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 22.05.20201.

Повторный аукцион состоится **11.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **10.08.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, 136-31-11.**

УНП 600154343

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Минский мясокомбинат» (продавец) проводит открытый аукцион**

## ПО ПРОДАЖЕ ИЗОЛИРОВАННОГО ПОМЕЩЕНИЯ, НАИМЕНОВАНИЕ – МАГАЗИН

**с инв. № 500/D-1003744 общей площадью – 543,7 кв. м, расположенного на земельном участке с кадастровым номером 500000000003001058 площадью 0,3585 га** *(право постоянного пользования, доля в праве 7/100)* **по адресу: г. Минск, тракт Игуменский, 47-2н.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона линий связи, пл. 0,0282 га; обеспечение доступа для производства ремонтно-восстановительных работ – эксплуатирующим организациям – владельцам инженерных сооружений, пл. 0,3585 га.*

*Запрет совершения регистрационных действий. Обременение будет снято до проведения аукциона.*

*Объект находится в залоге у ОАО «Сберегательный банк «Беларусбанк» Обременение будет снято до проведения аукциона.*

*Объект обременен договором аренды по 31.07.2025.*

Начальная цена с НДС *(20 %)* **– 1 470 000,00** бел. руб. (задаток 10 % от начальной цены **– 147 000,00** бел. руб.).

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней после дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель аукциона (единственный участник аукциона) оплачивает организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 2 (двух) процентов. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by.

Аукцион состоится **30.08.2021** в **12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.08.2021** до **16.00** по указанному адресу **в каб. 320.**

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17, (8029) 136-31-11.**

УНП 100003394

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

**Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (организатор аукциона) по поручению ОАО «Слуцкая фабрика пошива одежды» (продавец) проводит повторный открытый аукцион по продаже:**

**Лот № 1: АДМИНИСТРАТИВНОЕ ЗДАНИЕ** *(составные части и принадлежности: склад),* **инв. № 640/С-27207 общей площадью 318,7 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001008501** (право аренды по 07.04.2041) **площадью 0,1063 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0207 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 191 452,80 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены **– 19 145,28** бел. руб.). ***(Цена снижена на 20 %).***

**Лот № 2: ЗДАНИЕ ТОРГОВОГО ЦЕНТРА «КАЛЕЙДОСКОП», инв. № 640/С-27200 общей площадью 1 022,6 кв. м, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 624650100001009010** (право аренды по 07.04.2041) **площадью 0,0974 га по адресу: Минская область, г. Слуцк, ул. Уласовца, 3.**

*Земельный участок имеет ограничения в использовании: охранная зона сетей и сооружений теплоснабжения, пл. 0,0123 га.*

Начальная цена с НДС (20 %) **– 676 300,80 бел. руб.** (задаток 10 % от начальной цены **– 67 631,00** бел. руб.). ***(Цена снижена на 20 %).***

**Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ЦБУ № 701ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, БИКBPSBBY2X, УНП 690324015, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации».**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата объекта производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере: по лоту № 1 – 4(четырех) процентов, по лоту № 2 – 3 (трех) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов www.rlt.by. Предыдущее извещение опубликовано в газете «Звязда» от 16.09.2021.

Повторный аукцион состоится **30.08.2021** в **14.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **27.08.2021** до **16.00** по указанному адресу.

**Тел.: (8017) 516-80-65, 516-80-64, (8029) 102-21-17.**

УНП 600154407

**ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНЫХ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ по продаже недвижимого имущества**

Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга» извещает о проведении повторных электронных торгов № 2021.Ч.002.00027 по продаже недвижимого имущества на электронной торговой площадке ETPVIT.BY, по адресу: https://etpvit.by.

**Продавец:** открытое акционерное общество «Витебскмясомолпром», тел. +375 (212) 33-12-21.

**Организатор, Оператор электронной торговой площадки ETPVIT.BY:** коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», г. Витебск, проезд Гоголя, 5, тел.: +375 (212) 24-63-12, +375 (29) 884-96-79, +375 (29) 391-09-56, e-mail: vcm74@mail.ru, https://etpvit.by.

**Дата и время проведения повторных торгов**: 27.08.2021 в 09.00 (по времени на сервере ЭТП ETPVIT.BY).

**Лот № 1.** Капитальное строение с инвентарным номером 250/С-29562, расположенное по адресу: Витебская обл., Полоцкий р-н, Горянский с/с, д. Горяны, площадь – 77,9 кв. м, назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – здание магазина 29, расположенное на земельном участке с кадастровым номером 223882705101000048, площадью 0,0271 га, с целевым назначением – для содержания и обслуживания здания магазина. **Нач. цена:** 12 295,00 бел. руб. без учета НДС. **Задаток:** 1229,50 бел. руб.

Повторные электронные торги проводятся в соответствии с Регламентом ЭТП. **Для участия в электронных торгах** необходимо ознакомиться с Регламентом, зарегистрироваться на ЭТП по электронному адресу https://etpvit.by, внести задаток и подать документы на участие в торгах согласно информации об электронных торгах, размещенной на сайте ЭТП. **Срок внесения задатка и время окончания приема заявлений с прилагаемыми документами: до 16.00 26.08.2021. Сумма задатка перечисляется оператору электронных торгов на р/с:** № BY93MTBK30120001093300066782 ЗАО «МТБанк» г. Минск, БИК MTBKBY22, УНП 390477566. Получатель – ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Условия повторных электронных торгов**: победитель торгов (единственный участник торгов, выразивший согласие на приобретение предмета торгов по начальной цене, увеличенной на пять процентов) обязан возместить затраты на организацию и проведение торгов в соответствии со сметой затрат, оплатить услугу по размещению одного аукциона и затраты на обслуживание ЭТП согласно прейскуранту, размещенному на сайте ЭТП; заключить договор купли-продажи имущества в течение 14 рабочих дней со дня проведения электронных торгов, оплатить предмет электронных торгов в порядке и сроки, установленные договором купли-продажи, оплатить НДС 20 % сверх цены продажи предмета торгов. С подробной информацией о предмете торгов, порядке участия и оформления документов для участия в электронных торгах можно ознакомиться на сайте ЭТП ETPVIT.BY, по электронному адресу: https://etpvit.by, в разделе: недвижимое имущество. Ознакомиться с предметом торгов можно по предварительному согласованию с Продавцом по тел. +375 (33) 675 23 74.

## РЕЗУЛЬТАТЫ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «Опять двадцать пять. 4 тур»

Сведения об организаторе рекламной игры:

**Общество с дополнительной ответственностью «Астотрейдинг».**

УНП **690362737.**

Зарегистрировано **02.11.2005 № 961 Минским областным исполнительным комитетом.**

Местонахождение Организатора:

**223053, Республика Беларусь, Минская область, Минский район, д. Боровая, д. 7, административные помещения, кабинет № 24.**

Наименование рекламной игры: **«Опять двадцать пять. 4 тур».**

Рекламная игра зарегистрирована:

**Министерством антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, Свидетельство о государственной регистрации рекламной игры от 13.07.2021 за № 4039**.

Период проведения рекламной игры: **с 15.07.2021 по 28.07.2021 (включая период проведения розыгрыша, выдачи призов, опубликования результатов Рекламной игры).**

Количество участников Рекламной игры за весь период составило **1569 человек.**

Количество игровых номеров, участвующих в рекламной игре, составило **1886.**

Всего было проведено пять розыгрышей.

Призовой фонд рекламной игры разыгран полностью.

Победителем стали:

**1. Громова Анна Владимировна, выигравшая топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л., стоимостью 199,00 (сто девяносто девять рублей, 00 копеек).**

**2. Краснова Юлия Александровна, выигравшая топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л., стоимостью 199,00 (сто девяносто девять рублей, 00 копеек).**

**3. Митрохин Юрий Олегович, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л., стоимостью 199,00 (сто девяносто девять рублей, 00 копеек).**

**4. Назарук Дина Владимировна, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л., стоимостью 199,00 (сто девяносто девять рублей, 00 копеек).**

**5. Павловский Иван Иванович, выигравший топливные талоны АИ-95 и/или ДТ-Евро на 100 л., стоимостью 199,00 (сто девяносто девять рублей, 00 копеек).**

Телефон для справок по вопросам проведения рекламной игры:

**+375 17 233-33-33 с 10.00 до 18.00 в рабочие дни.**

Правила рекламной игры опубликованы в газете «Звязда» от 14.07.2021.

# ЧАМУ ЗНІКАЕ ВАДА З КРАНАЎ...

## «ГАРАБ'І КАЛОДЗЕЖ АБЯРНУЛІ»

Вады ў кранах і каналізацыі на верхніх паверхах некаторых двухпавярхоўікаў і трохпавярхоўіка аграгарадка Ярэмічы не было цэлы тыдзень. На першых паверхах невялічкі напор быў, так што суседзяў ратавалі. Аднак на вуліцах Маладзёжнай і Палявой вады не было нават у аднапавярховіках. Частка сетак тут належыць камунальнікам раёна, а частка — калгасу. Праблема з адсутнасцю вады была менавіта ў тых жыхароў, чые водаправодныя сістэмы знаходзяцца на балансе гаспадаркі. Асабістыя лічыльнікі на ваду тут ёсць далёка не ва ўсіх, таму, як высветлілася, несумленныя жыхары сапраўды гэтым карысталіся — палівалі грады, падключыўшы шланг проста да водапровада. Але ж ёсць і тыя, хто расходуе кубалітры для паліву адпаведна з сумай на лічыльніку.

Скажу адразу, шукаць правых і вінаватых я не збіралася, паколькі праблема з перабоямі вады ў краіне сапраўды ёсць, і вырашаць яе, як думаецца, трэба агульнымі намаганнямі, таму выслухала ўсе датычныя да «воднай» гісторыі бакі.

*— Вады ў кранах не было тыдзень, а камунальнікі гавораць, што гэта мы самі вінаватыя, бо агароды палівалі. Ды яшчэ кажуць, што многія незаконна ўрэзаліся ў водапровод, знайшлі ў людзей на градах шлангі. Я тут жыву 15 гадоў, і мы заўжды агароды палівалі. І лічыльнік у нас на доме стаіць — сума пасля на ўсе кватэры дзеліцца, мы ўсё роўна за яе заплацім,* — расказала **Ала, жыхарка аграгарадка Ярэмічы.** *— Пасля нашых скаргаў прыехалі спецыялісты, вінаватых адшукалі, людзі шлангі прыбралі — усе, нават хто па лічыльніках паліваў, але ж вада так і не з'явілася. А на ўсе нашы звароты на «гарачую» лінію чулі толькі адно: чакайце адказу. Атрымліваецца, як у той прыказцы: «гараб'і калодзеж абярнулі».*

Згодна з законам «Аб пітным водазабеспячэнні», забеспячэнне жыхароў дадзеным рэсурсам знаходзіцца ў кампетэнцыі мясцовых выканаўчых і распарадчых органаў, заўважыла ў адказ на агучаную праблему **Марына ТОЎСЦІК, начальнік упраўлення камунальнай гаспадаркі і энергетыкі Міністэрства ЖКГ:**

*— Водазабеспячэнне абанентаў і спажыўцоў у перыяд анамальных тэмператур патрабуе асаблівай увагі і тэхнічнай падрыхтоўкі сістэм водазабеспячэння арганізацыямі, якія аказваюць паслугі водазабеспячэння. Пры гэтым вельмі важна наладзіць тлумачальную работу з насельніцтвам і юрыдычнымі асобамі, каб выключыць або мінімізаваць нязручнасці карыстальнікаў цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння ў гарачы перыяд.*

**Непасрэднай забароны на водаспажыванне для вядзення ўласнай падсобнай гаспадаркі ў заканадаўстве няма. Чаму ж тады людзей вінавацяць у тым, што яны палліваюць агароды?**

*— Забароны няма, аднак законам вызначаны прыярытэт выкарыстання падземных водаў для пітных патрэб перад іншым іх выкарыстаннем,* — абазначыла Марына Тоўсцік. *— У артыкуле 38 Воднага кодэкса Беларусі вызначаны мэты карыстання воднымі аб'ектамі, і адна з іх — выкарыстанне для гаспадарча-пітных патрэб. А згодна з артыкулам 39, для гэтых патрэб могуць выкарыстоўвацца паверхневыя і падземныя воды, якасць вады ў якіх адпавядае гігіенічным нарматывам бяспекі. Падчас анамальна гарачага надвор'я трэба асабліва рацыянальна падыходзіць да выкарыстання вады, бо яна набывае асабліва высокую значнасць.*

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

## ВОДАЗАБОРЫ НЕ БЯЗДОННЫЯ

Што адбываецца з вадой на Карэліччыне (Ярэмічы — не адзінае мястэчка раёна, дзе ў вадаправодах дэфіцыт вады), расказалі кіраўнікі мясцовых органаў, на балансе якіх знаходзяцца водныя сеткі. Яны разлічвалі, што водаразбор павялічыцца ў 1,5-2 разы, аднак на справе гэтая лічба аказалася ў разы вышэйшая.

*— Па камунальных водаправодах праблем у раёне няма. Каля 85 % жыхароў мае лічыльнікі. Аднак падчас спёкі водаразбор вялікі, ідзе масавы паліў, таму і здараюцца збоі,* — тлумачыць **Аляксандр РУДАК, дырэктар Карэліцкай жыллёва-камунальнай гаспадаркі.** *— Але ж водазаборы не бяздонныя. Мы просім людзей ставіцца да расходу вады з розумам. Водаправодная сістэма сілкуецца ад падземных ваданосных пластоў, а пры такім надвор'і памяншаюцца іх аб'ёмы і ўзровень падземных водаў падае. У выніку помпы выхопліваюць са свідравін не ваду, а паветра. Абсталяванне псуецца і ціск падае, з вадой узнікаюць перабоі. Свідравіна не можа даць больш, чым у ёй ёсць. А жыхары стараюцца максімальна паліць грады, і ваду бяруць адкуль? З водапровода.*



Помпы ўвесь гэты час працуюць на поўнай магутнасці, аднак яны не паспяваюць выпампоўваць ваду з нетраў, таму пэўны час яе і не было, растлумачыў **Аляксандр ЛЕЙКА, старшыня камунальнага сельскагаспадарчага прадпрыемства «Царука»:**

*— Нам на нейкі час прыйшлося адключаць ад сеткі фермы, каб даць людзям ваду. Грунтовыя воды панізіліся, абмялеў і Нёман, нават калодзежы паперасыхалі. А яшчэ грамадзяне пачалі агароды палліваць актыўна. Мы ім тлумачылі, што расцягваць шлангі па градах нельга, бо вялікі перарасход вады атрымліваецца. Стаўце лічыльнікі і тады палівайце. А яшчэ ў нас некаторыя гаспадары на вуліцы, што пры Нёмане, павыкопвалі сабе цэлыя сажалкі на ўчастках і запаўняюць іх з водапровода, бо рака абмялела, уліку ж вады няма.*

Лічыльнікаў вады на сетках, якія належаць гаспадарцы, няма. І за незаконныя ўрэзкі ў водапровод старшыня пакараць рублём не можа — гэта прэрагатыва ЖКГ. У Ярэмічах чатыры воданапорныя вежы. Ад дзвюх з іх сілкуюцца фермы і палова дамоў аграгарадка.

*— Помпы мы не адключалі. Думалі, што недзе адбыўся прарыў трубапровода, калі вады не стала. Шукалі месца аварыі, але яе не было — проста вада не выпампоўвалася з нетраў. Трэба купляць помпу на запас, бо тая, што працуе беспярэпынна, можа ў любы момант згарэць. Тады мы зможам аператыўна яе памяняць.*

У раёне сёлета павінны збудаваць станцыю абезжалезвання. Па словах старшыні гаспадаркі, у ЖКГ ёсць запасная свідравіна, якую новымі водаправоднымі сеткамі злучаць са станцыяй. Тады нагрузка на вежы гаспадаркі паменшыцца, і сітуацыя з вадой у двухпавярхоўіках палепшыцца.

## ДЭФІЦЫТУ НЯМА, АДНАК ЭКАНОМІЦЬ ВАРТА

**Дык ці існуе ў Беларусі дэфіцыт пітной вады і ці можа ён узнікнуць увогуле, можа, час пачынаць нервавацца?** Агульнага закліку да эканоміі вады ў краіне, як гэта каторы год робяць у Амерыцы, у Беларусі няма. Наадварот, Мінпрыроды просіць гараджан паліваць саджанцы маладых дрэўцаў, каб тыя прыжыліся.

Згодна з данымі Дзяржаўнага воднага кадастру, водазабяспечанасць у сярэднім складае 6000 м³ на жыхара, што набліжана да сярэднееўрапейскіх паказчыкаў, адказаў **Аляксандр СТАНКЕВІЧ, дырэктар Цэнтральнага навукова-даследчага інстытута комплекснага выкарыстання водных рэсурсаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:**

*— Паверхневыя рэсурсы — вельмі дынамічны паказчык, і на працягу года іх характарыстыкі могуць моцна вагацца. Падземныя воды вызначаюцца больш стабільнымі характарыстыкамі. Тым не менш, у залежнасці ад тэмпературы паветра і колькасці ападкаў узроўні вады ў рэках і азёрах могуць рэзка павышацца ці памяншацца. Адпаведна, на асобных тэрыторыях краіны ў спякоту можа назірацца часовы дэфіцыт паверхневай вады. Аднак сёння і ў найбліжэйшай будучыні адсутнічае рызыка дэфіцыту падземных водаў для пітнога водазабеспячэння людзей.*

Праблема вялікага дэфіцыту вады неактуальная для Беларусі, упэўнены і ў ЖКГ, спецыялісты якога абапіраюцца на звесткі Дзяржаўнага кадастру нетраў і падлічаныя і пераацэненыя запасы радовішчаў падземных водаў.

*— Водныя аб'екты выкарыстоўваюцца на падставе дазволаў на спецыяльнае водакарыстанне ці комплексных прыродаахоўных дазволаў або дзяржаўнага акта на права адасобленага водакарыстання. Згодна з Водным кодэксам, забраныя паверхневыя воды ў аб'ёме 5 м³ і менш у суткі з прымяненнем водазаборных збудаванняў, а таксама здабытыя падземныя воды ў аб'ёме 5 м³ і менш у суткі з прымяненнем водазаборных збудаванняў могуць выкарыстоўвацца для паліву раслін ды паення жывёл ва ўмовах гарачага надвор'я,* — падкрэсліла Марына Тоўсцік.

На месцах глядзяць на праблему воднага дэфіцыту больш гаспадарча і практычна.

*— Людзі ў нас не лічаць пітную ваду і думаюць, што яна як мора. Яна ж на тое і пітная, каб яе піць, а не выліваць у агарод. Для гэтага можна браць ваду з рэк і сажалак. Запасы вады ўвогуле маюць тэндэнцыю да памяншэння. У спякоту яе трэба максімальна берагчы,* — мяркуе Аляксандр Рудак.

## НЕ СКОНЧЫЛАСЯ, А ПЕРАРАСХОДАВАЛАСЯ

**Зразумела, што расход вады летам павялічваецца, аднак ці можа праз гэта яна ўвогуле знікнуць?** Змены кліматычных умоў прывялі да ўздзеяння на прыродныя кампаненты, у тым ліку паўплывалі на ўзровень падземных вод, які значна панізіўся. Гэта, у сваю чаргу, прывяло да змен у рэжыме работы цэнтралізаваных сістэм водазабеспячэння і водаадвядзення, адзначыла Марына Тоўсцік:

*— Няправільна казаць, што вада скончылася з-за яе перарасходу. Пэўны яе дэфіцыт узнік праз перавышэнне ўжывання над натуральным прыродным аднаўленнем водных запасаў. Падобная сітуацыя часовая і штогод назіраецца ў асобных рэгіёнах краіны. Асабліва гэтае пытанне актуальнае ў малых населеных пунктах, дзе спажыванне вады ўзрастае ў некалькі разоў за кошт прыезду людзей на адпачынак летам, агародніцтва і напаўнення ўласных басейнаў. У выніку паніжаецца ціск у сістэме і ўзнікаюць перабоі ў водазабеспячэнні. Да таго ж у краіне зношана 33,9 % водаправодных сетак, і падчас работы ў рэжыме максімальнага водаразбору яны могуць пашкоджвацца.*

## ВОДАЗАБОР З АРТЭЗІЯНСКІХ СВІДРАВІН

Для беспярэбойнага водазабеспячэння сваіх спажыўцоў арганізацыі, якія адказваюць за гэта, падымаюць ціск у водаправодных сетках, падключаюць рэзервовае абсталяванне і задзейнічаюць усе вытворчыя магутнасці. Акрамя таго, водаканалы пастаянна маніторыць якасць падаванай у сетку вады, заўважыла прадстаўніца Мінжылкамгаса.

У найбольш выйгрышнай воднай сітуацыі знаходзіцца сталіца. Яна сілкуецца з пяці гарадскіх водазабораў, з якіх толькі на адным ёсць збудаванне водападрыхтоўкі. Чатыры водазаборы падаюць ваду з падземных крыніц без дадатковай водападрыхтоўкі, расказаў **Антон ГАЛАСКОК, начальнік вытворчасці «Мінскводаправод» КУП «Мінскводаканал»:**

*— Астатнія аб'екты знаходзяцца за межамі горада, найбольш аддалены — за 60 кіламетраў ад Мінска. Самае складанае і буйное збудаванне — ачышчальная водаправодная станцыя, якая адзіная падрыхтоўвае ваду з паверхневых водаў.*

Прадстаўнік Мінскводаправода дадае, што мэта да 2025 года забяспечыць усіх мінчан артэзіянскай вадой захоўваецца. Пры гэтым водаразборныя калонкі ў прыватным сектары сталіцы застануцца, дэманціраваць іх цэнтралізавана не будуць.

**Ірына СІДАРОК,**
**фота аўтара.**

# ТРЫ ДНІ Ў АРХЕАЛАГІЧНАЙ ЭКСПЕДЫЦЫІ



**Яркія палаткі, як вялізныя кветкі, вылучаюцца на жоўта-пясочным фоне пажухлай травы. Навокал — пах дыму, рамантыкі і гісторыі. А таксама — вясёлы гоман студэнтаў і ўвесь час чымсьці заклапочаных валанцёраў. Тры дні мы правядзём у археалагічнай экспедыцыі, якую праводзіць гістарычны факультэт БДУ.**

Да таго як усё гэта ўбачыць, давялося «прайсці» своеасаблівы квэст, каб дабрацца да месца прызначэння. І вось нарэшце аўтобус пад'язджае да прыпынку з кароткай назвай «Рэчкі». Менавіта ў гэтай вёсцы Вілейскага раёна размясціўся лагер археолагаў.

Суседка па аўтобусе, калі даведалася канчатковы пункт нашага маршруту, адразу прапанавала правесці і між іншым запытала:

*— А цікавае што-небудзь знайшлі ўжо?*

У той момант адказаць кампетэнтна на яе пытанне мы не маглі. Але дадзены матэрыял, спадзяёмся, зможа спатоліць цікаўнасць чытачоў, у тым ліку з вёскі Рэчкі. Археалагічныя будні пачынаюцца!

## ДЗЕНЬ ПЕРШЫ. СВЯТОЧНЫ

У лагеры мы апынуліся ў другой палове дня 16 ліпеня. Амаль увесь дзень тэрмометр паказваў за трыццаць градусаў, таму пасля доўгага падарожжа сіл хапіла толькі на тое, каб проста сесці ў цянёчку і назіраць.

Лагер экспедыцыі размясціўся на адным з вясковых падворкаў. Таму ў ім дзіўным чынам побач апынуліся вайсковыя, турыстычныя палаткі і драўляныя збудаванні. У лагеры ў такі час шматлюдна — працоўны дзень у студэнтаў скончыўся і яны адпачываюць. А валанцёры разам з кіраўнікамі раскопак працягваюць працаваць у другую змену.

Зусім нечакана высветлілася, што менавіта сёння для студэнтаў ладзіцца традыцыйнае свята «Грунвальд», прымеркаванае да гадавіны Грунвальдскай бітвы, якая адбылася 15 ліпеня 1410 года.

— *На час археалагічнай практыкі звычайна прыходзяцца тры святы: Купалле, «Грунвальд» і «Пасвят». На апошнім усіх студэнтаў, якія прайшлі археалагічную практыку да канца, сімвалічна пасвячаюць у археолагі. Грунвальдская бітва — значная падзея ў беларускай гісторыі. Яна была пераможнай для ВКЛ, таму гэты дзень не проста памятны, а святочны. Тым больш для гісторыкаў. Валанцёры імкнуцца зрабіць свята запамінальным для студэнтаў, каб усе разам маглі правесці час цікава і весела,* — расказвае Кацярына Кухарава, якая ўжо трэці раз бярэ ўдзел у археалагічнай экспедыцыі як валанцёр.

Надышоў вечар, усе справы скончаны і можна з чыстай душою святкаваць. Усе забыліся на стому ад спякотнага дня і цяжкай працы, вакол толькі энергічныя, жвавыя, з агеньчыкамі ў вачах людзі.

Аднекуль данесліся набаты і прызыўны кліч — па лагеры рушыць парад камандаў — «войскаў», якія бралі ўдзел у Грунвальдскай бітве. Пасля ўрачыстага шэсця студэнтаў чакаў тэматычны квэст. Мы зазірнулі на адну з лакацый. Там удзельнікам трэба было праявіць сваю археалагічную пад-рыхтоўку і адшукаць у ёмістасці з пяском сімвалічную індывідуальную знаходку.

Гэты дзень быў надзвычай насычаны і актыўны. А вось скончыўся ён неверагодна ўтульна — спевамі каля вогнішча пад зорным небам.

## ДЗЕНЬ ДРУГІ. ВЫПРАБАВАЛЬНЫ

Наступны дзень дазволіў убачыць экспедыцыйнае жыццё ва ўсіх яго фарбах. Вядома, што археолаг — прафесія не з лёгкіх. Той, хто выязджае на раскопкі, вымушаны жыць у спецыфічных умовах: рамантыка рамантыкай, а камароў, спёку і безабароннасць перад прыроднымі выпрабаваннямі ніхто не адмяняў. Але менавіта ўсё гэта і з'яўляецца адной з галоўных каштоўнасцяў археалагічнай экспедыцыі.

— *Археалагічная экспедыцыя — маленькая армія. Тут у кожнага з нас няма асабістага, тут чалавек такі, які ён ёсць на самай справе. Таксама ў экспедыцыі вельмі добра развіваюцца сацыяльныя навыкі,* — расказваюць валанцёры, якія шмат гадоў удзельнічаюць у раскопках.

І сапраўды, дысцыпліна ў археалагічнай экспедыцыі блізкая да вайсковай: дакладны распарадак дня і размеркаванне абавязкаў.

Сённяшні дзень паслясвяточны, таму сняданак і выхад на раскоп адбыліся пазней. Звычайна ж на раскоп усе выпраўляюцца а палове восьмай раніцы. Але лагер не бывае пусты — у ім застаюцца дзяжурныя студэнты і валанцёры. Яны будуць гатаваць абед і ўвогуле сачыць за парадкам.

Тых жа, хто ў гэты дзень працуе на раскопках, чакае 20 хвілін шляху пад гарачым ранішнім сонцам. Варта адзначыць, што яшчэ ў лагеры мы раздзяліліся на невялікія групы.

— *У нас закладзены тры раскопкі: на гарадзішчы, на селішчы і ёсць яшчэ раскоп на кургане,* — расказвае Паліна Сяргееўна Курловіч, кіраўнік экспедыцыі.

Мы вырашылі наведаць селішча. Раскоп, закладзены на ім, самы вялікі і самы багаты на знаходкі. А дылетанта яны цікавяць найбольш.

Работа на раскопе ўражвае, бо ўвогуле нагадвае вялікі мурашнік, дзе кожны працавіты насельнік ведае сваю справу, дзе індывідуальнымі бываюць толькі знаходкі, дзе ўсе дапамагаюць адзін аднаму і дзе сярод знешняга хаосу дакладна відаць унутраны парадак.

Непрафесіяналу цяжка зразумець, чаму менавіта гэтае месца выбралі для даследавання, але Паліна Сяргееўна заўсёды гатовая растлумачыць. Здаецца, што пра раскопкі яна можа расказваць бясконца, не страчваючы імпэту:

— *Па храналогіі гэта сярэдзіна першага — пачатак другога тысячагоддзя нашай эры. Людзі тут жылі з эпохі вялікага перасялення народаў. На селішчы ў нас зона, дзе жылі людзі, адпаведна, там ёсць жылыя аб'екты, жытлы. Летась у нас там ужо быў закладзены раскоп, і мы цяпер прырэзаліся да яго і ўскрываем цалкам тое жытло, якое выяўлена ў мінулым годзе.*

Хутка мы перасталі ацэньваць значнасць месца па колькасці знаходак: далучэнне да археалогіі ў такім заматываваным асяроддзі непазбежнае. Тым больш кожная з трох раскопак насамрэч з'яўляецца вельмі цікавым навуковым аб'ектам для даследавання.

— *Мы капаем тую частку гарадзішча, дзе людзі займаліся металургіяй. Летась у нас там быў шурф, дзе мы выявілі рэшткі печы-домны для вытворчасці крыцы, з якой потым рабілі жалеза і, адпаведна, мы спадзяёмся, што атрымаецца выявіць там жа іншыя металургічныя аб'екты,* — расказвае нам Паліна Сяргееўна Курловіч.

Пра курганны могільнік нам распавялі супрацоўнікі лабараторыі музейнай справы БДУ Лізавета Кісялёва і Алег Сахончык:

— *У ходзе работы экспедыцыі было выяўлена ўрнавае пахаванне другой паловы I тыс. н. э. У перакулены гаршчок былі ссыпаныя крэміраваныя косткі. Пакуль само пахаванне не разбіралася, але папярэдне можна сказаць, што яно датуецца другой паловай I тыс. н. э., да прыняцця хрысціянства. Гэта ўнікальная для айчыннай навукі знаходка, такія пахавальныя комплексы на тэрыторыі Беларусі практычна не даследаваліся. Побач з пахаваннем былі зафіксаваныя сляды ворыва, якое папярэдне можна да-*





*таваць сярэдневяковым часам. Магчыма, гэта рэшткі гаспадарчай дзейнасці, а магчыма, сляды нейкага рытуалу. Цяпер вядуцца работы на шырокай плошчы вакол выяўленага пахавання, з мэтай зразумець будову могільніка. Выяўлены асобныя крэміраваныя косткі чалавека і фрагмент пераплаленага ўпрыгажэння з бронзы.*

Як ужо адзначалася, знаходак у археолагаў вельмі шмат. Але кожная з іх можа стаць карыснай крыніцай інфармацыі і шмат расказаць пра людзей, якія тут жылі, іх быт.

— *Пакуль рана казаць, якая знаходка самая значная. Але, тым не менш, ужо ёсць шэраг цікавых матэрыялаў. Гэта ўпрыгажэнні і дэталі адзення: падвескі, фрагменты спражак, некалькі фрагментаў бранзалетаў, скроневыя кольцы культуры смаленска-полацкіх доўгіх курганоў. Вельмі шмат было знойдзена гліняных прасніц, якія выкарыстоўваліся для прадзення. Пэўна, у жыхароў быў распаўсюджаны такі промысел, у вялікіх маштабах яны гэтым займаліся. Таксама знаходзім розныя інструменты, звязаныя з бытавой культурай, прылады працы: шылы, нажы і г. д. Яшчэ тут прысутнічае кераміка — ляпная і раннеганчарная, у тым ліку арнаментаваная хвалістым і лінейным арнаментам.*

Работа са знаходкамі не абмяжоўваецца магчымасцямі экспедыцыі. Існуюць знаходкі, якія становяцца карыснымі толькі пасля спецыяльнага аналізу.

— *На ўзроўні тых пластоў, да якіх мы дайшлі, пачалі сустракацца косткі жывёл у дастаткова вялікай колькасці, чакаецца, што глыбей іх будзе яшчэ больш. Мы іх затым будзем аналізаваць, высвятляць, якіх жывёл тут ужывалі ў ежу на гэтым паселішчы, і, магчыма, атрымаецца зрабіць нейкія высновы аб гаспадарцы. Акрамя таго, у нас ёсць праект сумесны з расіянамі. Згодна з ім, мы даследуем зоны гаспадарчага асваення ў эпоху вялікага перасялення народаў. Таму мы робім шурфы вакол селішча, шукаем сляды старажытных разворванняў, будзем браць аналізы на пылок раслін, споры, пасля рабіць паліналагічны аналіз. Магчыма, атрымаецца высветліць, якія культуры тут вырошчваліся. Будзем таксама аналізаваць інструменты, пры дапамозе якіх апрацоўвалі зямлю.*

У наш жа дзень на раскопе актыўна знаходзяць вугаль. Але тым, каму трапілася такая знаходка, належыць быць надзвычай асцярожнымі і не датыкацца да яе рукамі. Самыя буйныя кавалкі вугалю збіраюцца ў асобныя мяшэчкі.

— *Пасля мы будзем рабіць радыявугляродны аналіз вугельчыкаў. І такім чынам паспрабуем вызначыць больш вузкія даты функцыянавання селішча,* — тлумачыць Паліна Сяргееўна.

На раскопе мы ўжо пяць гадзін — і вось нарэшце збіраемся і рушым у лагер, дзе нас чакае смачны абед. Планавалася, што пасля абеду і невялікага адпачынку работа на раскопе працягнецца, але прырода ўносіць свае карэктывы. Спёка змянілася спорным, а пасля і шквалістым дажджом, які падарыў свежасць і разбурыў жытло некалькіх чалавек — у тым ліку і наша. Што ж, надарылася яшчэ адна нагода зведаць усю прыгажосць беларускага зорнага неба!

## ДЗЕНЬ ТРЭЦІ. РАЗВІТАЛЬНЫ

Шчыра прызнаемся, што з'язджаць са штохвіліннай рамантыкі ў звычайную будзённасць было складана. Працэс раскопак аказаўся такі захапляльны, што чаканне наступнага дня можна параўнаць з чаканнем новага эпізоду дэтэктыўнага серыяла.

За тры дні ў археалагічнай экспедыцыі мы зрабілі цікавае назіранне. Археолагі часта кажуць «мы плануем», «спадзяёмся», «верагодна», «мабыць». І зусім не таму, што гэтыя працавітыя людзі недастаткова сур'ёзныя, не. Проста гісторыя любіць рабіць сюрпрызы. І сённяшняя руціна заўтра можа стаць сенсацыяй. Што ж, пачакаем. Наперадзе яшчэ два тыдні.

**Алёна КУХАРАВА.**
**Фота Лізаветы КІСЯЛЁВАЙ і аўтара.**

# ПАСТКІ ДЛЯ ПАКУПНІКА

## Сабралі хітрасці, якія прымушаюць нас купляць больш, чым мы планавалі

**Вы прыйшлі ў гіпермаркет па хлеб і нават кошык каля касы браць не сталі — бо вам патрэбны толькі хлеб і больш нічога. Але па дарозе вы прыхапілі яшчэ некалькі тавараў «па акцыі» з разраду «ў гаспадарцы спатрэбіцца». І вось вам ужо не хапае рук. Вы вяртаецеся да касы за кошыкам... і ў выніку сума ў чэку аказваецца значна большая за тую, якую вы збіраліся выдаткаваць першапачаткова.**



Ці, напрыклад, сабраліся купіць простую белую майку. А ў выніку набылі «да яе» яшчэ і спадніцу, і набор упрыгажэнняў (хоць зусім не планавалі), а потым — яшчэ і гарнітурчык для дзіцяці. Або вырашылі набыць смартфон, а купілі яшчэ і аксесуары да яго. Калі сітуацыя вам знаёмая — а хутчэй за ўсё, гэта так, то вы... невінаватыя. Проста вы (як і вельмі многія) сталі ахвярай псіхалагічных пастак, якія расстаўляюць на пакупнікоў маркетолагі. Уласна кажучы, большасць з гэтых пастак не новая і даўно апісаная і ў падручніках, і ў артыкулах. Але мы, пакупнікі, усё роўна «вядзёмся» на іх, хоць і ведаем, што самы дарагі тавар заўсёды выстаўляецца на паліцах на ўзроўні вачэй, а самы непатрэбны (дробязі ў яркіх упакоўках) — у касавай зоне.

### Навуковы падыход да нашага кашалька

Маркетынг — гэта ў першую чаргу навука, а маркетынгавыя хады становяцца вынікам даследаванняў пакупніцкага попыту і рэакцый на тыя ці іншыя «раздражняльнікі». Як і ў любой навуковай сферы, тут ёсць свае таленты і свае навуковыя працы. Напрыклад, Пака



Андэрхіл, якога называюць «Шэрлакам Холмсам свету гандлю», прысвяціў сваю кнігу «Чаму мы купляем» інтэлектуальнай бітве паміж спецыялістамі па маркетынгу і ўсё больш разумным і недаверлівым сучасным пакупніком.

У гэтай барацьбе маркетолагі зыходзяць з таго, што на самай справе чалавек купляе не тавар, а шчасце, спакой і станоўчыя эмоцыі. А таксама з таго, што любой куплі папярэднічае прыняцце рашэння.

Наш мозг нейрафізіёлагі дзеляць на тры «падраздзяленні». Гэта ўласна «чалавечы мозг» — ён адказвае за логіку і наша ўсвядомленае жыццё. «Мозг млекакормячага» адказвае за эмоцыі — стваральнікі меладрам звяртаюцца менавіта да гэтай часткі нашага мозга. А «рэптыльны мозг» у адказе за выжыванне дадзенай канкрэтнай асобіны. Галоўныя пытанні, на якія шукае адказы «рэптыльны мозг», вывучаючы навакольны свет, — самыя простыя і найбольш жыццёва важныя, яны звязаныя з выжываннем. І менавіта да гэтай часткі нашага мозгу апелююць некаторыя «пасткі» маркетынгу. Напрыклад, раскручаныя брэнды ў сваёй рэкламе («Большасць дамашніх гаспадынь выбірае гэты сродак для мыцця» або «78 % жанчын пацвердзілі эфектыўнасць гэтага крэму ад маршчын»). Калі тысячы людзей пацвердзілі бяспечнасць і эфектыўнасць дадзенай прадукцыі, значыць, гэта добрая рэч, пераконвае нас «рэптыльны мозг». Ён жа прымушае чытаць водгукі аб таварах і паслугах у інтэрнэце і робіць нас залежнымі ад чужога меркавання.

Гармон дафамін адказвае за задавальненне ад працэсу пошуку і атрымання любой новай інфармацыі. Калісьці наяўнасць гэтага гармону дазволіла чалавецтву выжыць: вывучаючы свет, людзі знаходзілі аптымальнае рашэнне тых ці іншых задач. За задавальненне ад азартных гульняў таксама адказвае дафамін — ён стымулюе жаданне выйграць. І ён жа прымушае нас купляць тавар «танней на акцыі» (тры па цане двух). А таксама выклікае схільнасць да куплі пад уздзеяннем «пачуцця ўзаемнасці».

У кнізе Роберта Чалдзіні «Псіхалогія пераканання» апісана паняцце ўзаемнасці як адзін са спосабаў павысіць продажы. Напрыклад, адзначае даследчык, пласцінка жавальнай гумкі, прынесеная афіцыянтам у кафэ разам з рахункам у якасці камплімента ад установы, павялічвала памер чаявых да 20 %. Тое ж самае датычыцца і продажаў у краме. Добразычлівыя, уважлівыя кансультанты ў гандлёвай зале выклікаюць падсвядомае жаданне набыць тавар.

### Што такое кагнітыўныя скажэнні?

Гэта сістэматычныя памылкі мыслення, на якіх будуюцца шматлікія «пасткі» на пакупніка. Напрыклад, у чалавечай псіхалогіі закладзена нелюбоў да страты чаго б там ні было. Тавары з бясплатным перыядам тэсціравання — сюды ж. Як правіла, гэта дарагія тавары зусім не першай неабходнасці: бытавая тэхніка (тыя ж робаты-пыласосы: без такога цуду тэхнікі цалкам можна абысціся, але ж ён ужо ў цябе дома, фактычна твой, ты ўжо рэакцыю свайго ката на гэты пыласос зняў на відэа — як аддаць назад?), дамашнія трэнажоры ( мацаваць прэс можна і проста на падлозе, а бегаць — у парку, але ж на трэнажоры весялей і цікавей — пакуль не надакучыць, але не кожны пра гэта задумваецца), масажныя крэслы і г. д. З гэтай жа серыі — разнастайныя дэгустацыі ў гіпермаркетах, а таксама прымерачныя з выгадным асвятленнем і адмысловымі люстэркамі (што робяць нас страйнейшымі і нібы запрашаюць да сэлфі). А калі вы ўжо выкажылі сябе ў абноўцы ў сацсетках, неяк нелагічна не купіць упадабаны вобраз. І, вядома, акцыі накшталт «дамашні інтэрнэт: першы месяц бясплатна», «тарыф мабільнай сувязі першыя некалькі месяцаў за палавіну кошту», адукацыйныя курсы з бясплатнымі пробнымі ўрокамі — спіс можна працягваць.

Або такое скажэнне, як імкненне не выпусціць выгаду: акцыі і зніжкі, два тавары па цане аднаго, тавар у падарунак — гэтыя прыёмы старыя як свет, але яны працуюць. Пра гэта ж — ілюзія абмежаванага часу, калі трэба паспець да канца распродажу (напрыклад, таймер у інтэрнэт-крамах: калі аформіце куплю за 20 хвілін, атрымаеце зніжку), пра тое ж — абмежаваная серыі тавару (прыём таксама шырока выкарыстоўваецца ў інтэрнэт-гандлі, калі мы бачым, што «засталося дзве адзінкі дадзенага тавару»). З аднаго боку, вы адчуваеце сябе разумным і спрытным — вы паспелі купіць тавар і сэканомілі грошы. З другога — у вас няма часу спыніцца і задумацца, а ці патрэбен вам гэты тавар наогул.

Вядомы псіхалагічны эксперымент, калі групе людзей было прапанавана аднолькавае пячэнне ў двух пачках — адзін быў поўны, другі на дзве трэці пусты. І пячэнне ў паўпустым пачку здалося людзям смачнейшым, чым у поўным. Па гэтым жа прынцыпе ствараецца «штучны попыт» у гіпермаркетах, калі з шэрагу тых ці іншых прадуктаў на паліцы спецыяльна прыбіраецца частка тавару, каб здавалася, што яго актыўна бяруць пакупнікі.

### Гук, пах, колер

Яны адыгрываюць у нашым рашэнні аб набыванні большую ролю, чым можа здацца. Пачнём з колеру. Заўважылі, што цэннікі на зніжку звычайна ярка-жоўтыя (аранжавыя)? У прыродзе гэты колер заўсёды прыцягвае найбольшую ўвагу, і акцыі не застануцца незаўважанымі. Чорны асацыюруецца з рэспектабельнасцю і высокім узроўнем жыцця — з ім аздабляюцца нятанныя тавары. Зялёны ў падсвядомасці — даўно і трывала «колер дазволу»: паводле даследаванняў, тавар з такімі цэннікамі часцей выбіраюць, а кнопку «Дадаць у кошык» зялёнага колеру часцей націскаюць. Чырвоны і ружовы колеры ўпакоўкі або цэнніка звычайна нацэлены на жаночую палову пакупнікоў — менавіта жаночай псіхіцы яны здаюцца прывабнымі. Маркетолагі пішуць, што змясціўшы «жаночы» тавар ва ўпакоўку такога колеру, яго можна прадаць працэнтаў на 10 даражэй.

Такім чынам, любая купля — гэта рашэнне, якое можна прымаць на аснове логікі, а можна — пад уздзеяннем эмоцый. І сучасныя маркетынгавыя тэхналогіі імкнуцца дасягнуць максімальнай долі эмоцый у вашым рашэнні. Пах непасрэдна ўплывае на нашы эмоцыі. Пахі свежаскошанай травы і іглiцы, сандалу і ружы супакойваюць, у дзіцячых аддзелах выкарыстоўваюцца яркія, радасныя пахі фруктаў. Пахі свежай выпечкі і карыцы абуджаюць апетыт (ідэальна для прадуктовых «гіпераў»), лімон — бадзёрыць і павышае настрой, а пах кавы з малаком або малочных дэсертаў робіць наш розум менш крытычным, і нам становіцца прасцей расстацца са «сваімі кроўнымі». Але самы распаўсюджаны «магазінны» пах — ваніль. Гуру маркетынгу пішуць, што ён здольны павялічыць продажы на 15—20 %.

Цяпер пра музыку. Спецыялісты сферы маркетынгу адзначаюць, што ў крамах яна павінна быць ненадакучлівая і мець пэўны тэмп для розных выпадкаў. Напрыклад, у большасці гандлёвых цэнтраў выкарыстоўваюць досыць мерныя, расслабляльныя кампазіцыі — не больш за 50—55 тактаў у хвіліну. Такая музыка дапамагае кліенту адчуваць спакой і камфорт, ён даўжэй застаецца ў краме і, адпаведна, колькасць пакупак узрастае. У «фікспрайсах» і іншых крамах з таннымі таварамі, дзе важны пастаянны паток кліентаў, выкарыстоўваюцца значна больш энергічныя музычныя кампазіцыі. Пад іх уздзеяннем людзі хутчэй перамяшчаюцца паміж радамі тавару і хутчэй рашаюцца купляць.

І, нарэшце, смак. Як вядома, хто любіць гарбуз, а хто агуркі, але ў самых розных людзей і тут ёсць падабенства — смакі, якія нагадваюць пра той час, калі мы былі шчаслівыя, здаюцца нам непаўторнымі. На гэта, напрыклад, накіравана самая розная рэклама пад агульным слоганам «Смак дзяцінства» (напрыклад, тое ж марожанае «28 капеек»). Дзяцінства і шчасце — гэта ж у большасці выпадкаў сінонімы.

### Арганізацыя прасторы

Вернемся да прыкладу з пакупніком, якому патрэбен толькі хлеб. У сучасных крамах, каб набыць самыя простыя прадукты — хлеб, малако, кефір, вам давядзецца прайсці праз усю гандлёвую залу. Разлік на тое, што па дарозе вы абавязкова прыхопіце тое-сёе, акрамя хлеба-малака. Бо дарогу вам раз-пораз заступаюць стэнды акцыйных тавараў. Прастора выбудоўваецца так, каб чалавек, змяняючы кірунак руху, абышоў як мага больш паліц. З гэтай жа мэтай у супермаркетах досыць часта робяцца перастаноўкі: у пошуках патрэбнага тавару вы будзеце блукаць сярод мноства спакус.

Большасць акцыйных стэндаў размешчана бліжэй да кас — у касавай зоне пакупнікі праводзяць шмат часу. Тут жа знаходзіцца размаітая дробязь, у якой дзве задачы: па-першае, заняць пакупніка, якому сумна стаяць у чарзе ў касу, і апынуцца ў яго ў кошыку (значная частка такога тавару разлічана на дзяцей), а па-другое — не даць выкласці назад тавар, які чалавек, падумаўшы, палічыў непатрэбным. Таму паліцы так шчыльна забітыя «жуйкамі» і шакаладкамі — выкласці тавар папросту няма куды.

І яшчэ адзін нюанс: вялікія карзіны на калёсах у крамах. Даследчыкі пішуць, што за апошнія дзесяцігоддзі яны па ўсім свеце сталі прыкладна на 30 % больш ёмістыя. Гэта таксама псіхалогія — пакупнік падсвядома імкнецца напоўніць «каляску» пакупкамі, і пакуль яна застаецца паўпустая, працягвае набіраць тавар.

### Што ж рабіць?

Як ні банальна, перад паходам у гіпермаркет па прадукты харчавання — паешце. І складзіце спіс пакупак, каб не набіць кошык усім, да чаго рукі дацягнуліся. Ці проста сфатаграфуйце змесціва свайго халадзільніка. Гэта дапаможа не браць у краме тое, што не патрэбнае (і не забыцца на тое, што — наадварот).

Не забывайце ўзяць з дому сумку замест пакупных пакетаў. Па-першае, гэта экалагічна, па-другое, рубель з граша паходзіць. Тое, што доўга захоўваецца, лепш купляць оптам, у буйной фасоўцы — крупы, цукар, сланечнікавы алей і г. д.

Выбіраючы адзенне, а тым больш адважваючыся на буйную куплю (бытавая тэхніка, аргтэхніка), дайце сабе час абдумаць магчымае набыццё. Адкладзіце куплю на некалькі дзён. Так вы пазбегнеце імпульсіўных дзеянняў і прымеце рашэнне з дапамогай логікі, а не эмоцый.

**Дзіяна РОНІНА.**

БЕЛ ВЭБ

**Наименование банка: ОАО «Банк БелВЭБ»**

Юридический адрес ОАО «Банк БелВЭБ»:
Республика Беларусь, 220004, г. Минск, просп. Победителей, 29

Форма 1

## БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС
на 1 июля 2021 г.

Наименование банка ОАО «Банк БелВЭБ»

(в тысячах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | на 01.07.2021 | на 01.01.2021 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 57 534 | 67 540 |
| 3 | Драгоценные металлы и драгоценные камни | 1102 | 5 | 21 |
| 4 | Средства в Национальном банке | 1103 | 544 352 | 597 442 |
| 5 | Средства в банках | 1104 | 134 058 | 204 415 |
| 6 | Ценные бумаги | 1105 | 855 991 | 750 933 |
| 7 | Кредиты клиентам | 1106 | 2 827 605 | 3 116 721 |
| 8 | Производные финансовые активы | 1107 | 4 756 | 26 |
| 9 | Долгосрочные финансовые вложения | 1108 | 13 493 | 13 363 |
| 10 | Основные средства и нематериальные активы | 1109 | 109 031 | 101 916 |
| 11 | Доходные вложения в материальные активы | 1110 | 5 342 | 2 |
| 12 | Имущество, предназначенное для продажи | 1111 | 8 069 | 1 229 |
| 13 | Отложенные налоговые активы | 1112 | 9 | 9 |
| 14 | Прочие активы | 1113 | 74 149 | 78 587 |
| 15 | ИТОГО активы | 11 | 4 634 394 | 4 932 204 |
| 16 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 17 | Средства Национального банка | 1201 | 20 780 | 27 |
| 18 | Средства банков | 1202 | 1 552 575 | 1 558 028 |
| 19 | Средства клиентов | 1203 | 2 339 422 | 2 642 890 |
| 20 | Ценные бумаги банка | 1204 | 67 368 | 78 809 |
| 21 | Производные финансовые обязательства | 1205 | 774 | 7 019 |
| 22 | Отложенные налоговые обязательства | 1206 | - | - |
| 23 | Прочие обязательства | 1207 | 34 263 | 39 440 |
| 24 | ВСЕГО обязательства | 120 | 4 015 182 | 4 326 213 |
| 25 | СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ | | | |
| 26 | Уставный фонд | 1211 | 117 408 | 117 408 |
